бяроза №3

№ 3/2017(1066)

ISSN 0320-7579

ІРАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ ЭМПІРЫЧНАГА ДЗЕ ШУКАЦЬ КРОПКУ АПОРЫ?

RЭZЭРВАЦЫЯ ГУЛЬНЯЎ: WARGAMING ПА-БЕЛАРУСКУ

Somnium*

«Гэта чымсьці падобна да сіндрому фантомнай канечнасці — бывае на вайне. Пацыенту здаецца, што ампутаваная канечнасць свярбіць, і ён адчувае боль, якога не можа быць. І мозг лічыць, што канечнасць усё яшчэ на месцы, бо яна для яго важная».

З серыяла «Пярэварацень»

*Somnium — з лацінскай «ілюзія» — тэма нумара

Юлія Спічакова

Учора ўсе мы былі шчаслівыя

Вельмі няпроста сказаць «да пабачэння». Але больш складана не згубіцца ў шчаслівым мінулым. Гэта здаралася са мной двойчы, і я больш не баюся. Напачатку міжволі пачынаеш знікаць у іншым часе, растварацца ва ўспамінах, чакаць сноў і харчавацца фотаздымкамі. Часам хочацца стаць уладальнікам машыны часу, але разумееш: гэта немагчыма.

Адзін пажылы чалавек няўзнак сказаў мне вельмі мудрую рэч: «Самае крыўднае ў гэтым жыцці тое, што яно хутка заканчваецца». Усяму ёсць канец. Усвядоміць гэта мы спрабуем на працягу ўсяго жыцця. Тэхніка барахліць час ад часу, людзі сыходзяць. А пакуль мы намагаемся змірыцца — праходзіць жыццё.

Мінулае добрае, таму што несапраўднае. Нічога нельга вярнуць без наступстваў. Я ведаю гэтых людзей з пустым позіркам. Яны адчайна спрабуюць затрымаць тое, што так імкліва ад іх сыходзіць. Мы ж так часта баімся нешта ўпусціць, адмаўляючыся заўважаць, што шчаслівыя тут і цяпер. Зараз, не азіраючыся назад, я маю ўсё, што трэба для шчаслівага жыцця. У мяне ёсць: любімая справа, выразная мэта, сям'я і сябры.

Мне стала цікава, што думаюць пра гэта іншыя людзі. Я запыталася ў сваіх сяброў: «Ці хацелі б вы вярнуць адзін дзень са свайго жыцця?»

«Я б хацела зноў ўпершыню ўбачыць акіян. На беразе амаль не было людзей. Я адчувала, як хвалі б'юцца аб ногі. У гэты момант немагчыма думаць пра праблемы. Усё здаецца такім нязначным у параўнанні з прыгажосцю акіяна».

«Мне зноў хацелася б адчуць тое хваляванне, калі я прызнаўся ў сваіх пачуццях каханай дзяўчыне. Мы разам пайшлі на канцэрт музычнай групы. У той дзень я перажыў невымоўныя адчуванні. Гэта было сапраўднае шчасце».

«У жыцці трэба ўсё паспець. Калі кожны раз вяртацца назад, то можна ніколі не прасунуцца наперад. Учора — паласа белая, сёння — чорная, а заўтра зусім не ведаеш, чаго чакаць. У гэтым — увесь азарт жыцця».

Асабіста я не магу ўявіць жыццё без тых эмоцый, якія я ўжо прачула. Успамінаю ўсе радасці і нягоды, што адбываліся са мной, з усмешкай на твары. Час дорыць лепшых людзей, і ён іх забірае. Кожнаму адведзена свая роля ў нашым лёсе. Варта вучыцца адпускаць. Не дзеля кагосьці. Дзеля сябе.

Нязменная мода: сумаваць па часе, якога больш няма. Сэнс сучаснасці заключаецца ў тым, каб шкадаваць аб мінулым. Ці не? З аднаго боку, чалавечая памяць перапоўненая лішняй інфармацыяй. Добра было б чысціць яе ад непатрэбных успамінаў, каб вызваліць месца для новых уражанняў. З іншага боку, кожны ўчынак нясе ў сабе ўрок. Некаторыя моманты робяць нас па-сапраўднаму шчаслівымі і натхняюць на неверагодныя рэчы.

Іронія лёсу ў тым, што яго няма?

Кацярына Тарасава

Так склалася, што ўсе мы чытаем праграмную літаратуру. Нехта — з задавальненнем, нехта — пад прымусам. І вось, вывучаючы твор Лермантава «Герой нашага часу», я спынілася на частцы «Фаталіст».

Што такое фаталізм? Гэта ўяўленне пра непазбежнасць усяго, што адбываецца навокал. А прасцей — вера ў лёс. І тут перада мной ўзнікла пытанне: а ці існуе ўвогуле лёс?

У сваім жыцці я не раз сустракалася з яго праявамі. Самае простае, што прыйшло ў галаву: знаёмства з «Бярозкай». Гады тры таму я пазнаёмілася з пісьменнікам Анатолем Зэкавым. Ён глядзеў прапанаваныя мной вершы і правіў іх для часопіса. Разам з гэтым я рыхтавалася да конкурсу чытальнікаў з яго вершам «Вуліца міру». Так склалася, што адбывалася гэта адначасова. Даслаць у часопіс нічога не паспелі, але ўявіце сабе маё здзіўленне, калі ў складзе журы конкурсу чытальнікаў прадставілі намесніка галоўнага рэдактара «Бярозкі». Асабіста пазнаёміцца не атрымалася б, калі б адзін член журы не запытаў мяне пра аўтара верша, што я чытала. Я расказала ўсю гісторыю, а Генадзь Петровіч папрасіў мяне і сябра застацца і даў адрас сваёй паштовай скрыні. І ці не лёс гэта? Здаецца, ён.

У сваім творы Лермантаў таксама даказаў існаванне лёсу, але ў нашым класе ўзнікла нямала спрэчак. Адны казалі, што няма ніякага лёсу, а іншыя былі прыхільнікамі тэорыі фаталізму. Першыя даказвалі: «Мы самі вартыя вырашаць, як будзем жыць». Другія пярэчылі: «Кожнае вырашэнне — справа лёсу».

Як вынік, кожны застаўся пры сваім. Але ці можа быць нейкі катэгарычны адказ на гэта пытанне? Напэўна, не. Нават Якуб Колас прытрымліваўся дзвюх супрацьлеглых тэорый. З аднаго боку, «добра быць ў дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш». І разам з гэтым: «Дарога паслушна волі Бога». Класік цалкам мае рацыю. Дык вось пытанне, а ці павінен быць пэўны адказ?

Нехта скажа: не бачым, не чуем — не існуе! Але давайце разбірацца. Выпадковыя сустрэчы, выйгрыш у латарэю, тое, што чалавек не можа кантраляваць, — ці нельга аднесці да лёсу? Здаецца, можна. А калі наяўнасць лёсу кажа пра прадвызначанасць жыцця, тады навошта нам даецца выбар? Навошта мы павінны адказваць за свае ўчынкі, калі яны вырашаныя загадзя? Таксама несупадзенне...

Напэўна, кожны хоць раз чытаў гараскоп. Нехта верыць у шостае пачуццё. Мабыць, яны змогуць растлумачыць, што нас чакае ў жыцці. А ці не можа гэта даказваць існаванне лёсу? Бо як можна прадказаць тое, чаго няма? Але калі мы ведаем, што нас чакае, і можам гэта змяніць, ці не падманка тады гэтыя гараскопы ды экстрасэнсы? Напэўна, так...

З якімі ілюзіямі ў жыцці вам давялося развітацца?

Настасся Дульзон, 17 гадоў, школьніца, мадэль:

— У 17 гадоў у маю галаву ўпершыню прыйшла думка: «Я нічога не змагу». Аднойчы вырашыла плюнуць на ўсё і хоць раз паверыць у свае сілы. Шмат злавалася, але злосць стала прыдатным палівам для старту. Сёння я назаўсёды развіталася з ілюзіяй «нічога не змагу».

Святлана Ляўчук, 48 гадоў, псіхолаг, выхавальніца ў дзіцячым садку:

— У маім жыцці была толькі адна ілюзія. Думала, што бацькі будуць жыць вечна. Я зразумела: калі памірае родны чалавек, мы адчуваем боль, роўны таму цяплу, якое атрымалі ад яго за ўсё жыццё. Пакуль тыя, хто любіць вас, побач, паспрабуйце павялічыць боль, які вы адчуеце, калі яны сыдуць.

Ян Мусвідас, 12 гадоў, школьнік, спявак:

— Раней я думаў, што чытаць кнігі — бескарысны занятак. Мне здавалася, што ўсю неабходную інфармацыю можна знайсці ў інтэрнэце. Ведаю шмат падлеткаў, якія думаюць, як я раней. Маё меркаванне змянілася, калі зноў пачаў чытаць, — усвядоміў, што гэта вельмі карысна і пазнавальна. Стала лягчэй фармуляваць думкі, узбагаціўся слоўнікавы запас, я атрымаў новыя веды. Не з інтэрнэту, а менавіта з кнігі! Добрая кніга развівае ўяўленне, радуе і стымулюе жаданне рухацца далей.

Яўген Перлін, 27 гадоў, тэлевядучы, шоумэн:

— Ілюзій у жыцці шмат. І з некаторымі я не спяшаюся развітвацца. Напрыклад, веру, што большасць беларусаў не страціла энтузіязм і гатова на сваёй працы рабіць крышачку больш, чым проста выконваць свае службовыя абавязкі. А з тых, з якімі развітаўся, — людзей не псуе кар'ера. Я доўгі час верыў, што, прасоўваючыся ўверх па службовай лесвіцы, людзі могуць захоўваць сваю чалавечнасць і прыстойнасць. Але часцей за ўсё яны мяняюцца кардынальна і становяцца іншымі людзьмі.

Людміла Шпакава, 41 год, настаўніца музыкі, вакаліст:

— Прыказка «Стаўся да людзей так, як хочаш, каб яны ставіліся да цябе», на жаль, не працуе. Я пераканалася: чым больш дабра робіш людзям, тым больш у іх выяўляецца нахабства і зайздрасць, яны здраджваюць. Вось такая мая жыццёвая ілюзія.

Кірыл Чобат, 27 гадоў, дырэктар турфірмы, баксёр:

— Мне не даводзілася развітвацца з ілюзіямі, бо ў мяне іх практычна не было. Але, на мой погляд, ілюзія, з якой многім трэба развітацца, — гэта адчуванне, што ўсё будзе адбывацца само па сабе! Пакуль ты нічога не зробіш, нічога не адбудзецца!

Міхаіл Гаўрош, 70 гадоў, пенсіянер, дырэктар на транспартным прадпрыемстве:

— Я развітаўся з ілюзіяй, што бег і хадзьба ў маім узросце непрымальныя. Зараз я люблю бегаць і хадзіць пешшу — жыццё прымусіла. І вагу скінуў. Дарэчы, ілюзія, што вагу скінуць не змагу, — бязглуздзіца. Я схуднеў на 10 кілаграмаў, займаючыся спортам.

Аляксей Вайніловіч, 21 год, акцёр, музы́ка:

— Ілюзія, што ўсё застанецца такім, як я запомніў у апошні раз. Людзі, месцы, прырода, пахі, смакі будуць ранейшымі. Час ляціць імкліва, змяняючы нас і наша асяроддзе. Вядома, заўсёды прыемна аддацца настальгіі, успомніць добрыя моманты — пабываць у тых самых месцах, але не варта спрабаваць вярнуцца ў мінулае і прыходзіць у жах ад таго, як усё змянілася. Калі свядома прымаеш, што ўсё праходзіць і як раней ужо не будзе, у жыццё прыходзяць свежыя эмоцыі, яркія пахі і колеры, незабыўныя прыгоды.

Дзмітрый Багаслаўскі, 30 гадоў, драматург, рэжысёр:

— Напэўна, гэта такая дзіцячая ілюзія, што табе хтосьці штосьці павінен. Зараз ёсць усведамленне таго, што ўсё залежыць толькі ад мяне і толькі я адказваю за ўсё тое, што са мной адбываецца. Нельга перакладаць адказнасць на кагосьці іншага, наадварот, чым больш на табе адказнасці, тым больш гэта цябе дысцыплінуе, мабілізуе. А дысцыпліна ў творчага чалавека павінна быць, таму што ўжо даказана, што творчыя людзі больш за ўсё схільныя да пракрасцінацыі, але пісаць пра гэта мне страшна і не хочацца...

Антон Ліпкану, 20 гадоў, студэнт БДУ, бізнэс-аналітык:

— Ілюзія ўсёдазволенасці, адсутнасці адказнасці, таго, што ўсе жаданні можна выконваць адной пстрычкай пальцаў, ні з кім не параіўшыся і не прымаючы пад увагу грамадства, бо свет круціцца вакол цябе і толькі. Увогуле, ілюзія эгаістычнага шчасця. І яшчэ ілюзія таго, што менавіта цябе заўсёды абміне ўсё дрэннае, што яно здараецца толькі з іншымі. Не, не толькі з іншымі, ты таксама можаш страціць блізкіх людзей, трапіць у аварыю або проста памерці ад цагліны, якая можа на цябе звалiцца па дарозе на спатканне.

Падрыхтавала Марына Шантыр

Мядзведзік назаўсёды

Панядзелак. Здымкі «Калыханкі» прызначаныя на 10 гадзін раніцы. Гадзіннік паказвае 9.45, я дысцыплінавана сяджу на трэцім паверсе Белтэлерадыёкампаніі каля дзвярэй кіназалы, але нікога няма. Я не хвалююся, таму што за гэтымі дзвярыма будуць працаваць людзі творчыя, а іх не бянтэжаць умоўнасці.

У 9.50 з'яўляецца першая жывая душа. Я не спяшаюся заходзіць за ёй на здымачную пляцоўку, бо чакаю майго героя — нязменнага Мішку Топу — Уладзіміра Варанкова.

Уладзімір Міхайлавіч прыходзіць роўна а 10-й, як быццам адмыслова хоча выйграць час. Наш герой ветліва ўсміхаецца і спяшаецца пазнаёміць мяне з усімі членамі вялікай каманды «Калыханкі». Над стварэннем перадачы працуе цэлы штат: акцёры (усе героі «Калыханкі»), рэжысёр, аператар, мастак-пастаноўшчык, аўтары сцэнарыяў, гукарэжысёр, прадзюсар, асвятляльнік і рэдактар.

Аказваецца, сама камера ўключыцца толькі ў 10.30, а дадатковыя паўгадзіны вылучаныя на падрыхтоўку. За адзін панядзелак здымаюць цэлы шэраг выпускаў. Запіс ідзе прыкладна да пяці вечара.

Акцёрам раздаюць тэксты, яны знаёмяцца з імі і вылучаюць свае рэплікі. Суфлёра на пляцоўцы няма, таму акцёры-лялечнікі проста лепяць пры дапамозе скотчу свае паперчыны з тэкстам у даступнае для вачэй месца. Пачынаецца міні-рэпетыцыя. Гэта працэс цікавы і дзіўны для чалавека, далёкага ад такой справы, бо ў час «прагонаў» акцёры часта жартуюць, але ні на секунду не выходзяць са сваіх вобразаў. Буслік пачынае спяваць песню «Надежда — мой компас земной», Топачка радасна падхоплівае. Вясёлы дуэт толькі паспеў выканаць куплет і прыпеў, як рэжысёр гучна аб'яўляе: «Дзякуй, прыступаем», — і праца над новай дзіцячай казкай пачынаецца.

Скажу так: тое, што адбываецца ў павільёне, выглядае не так казачна, як на экране. Я прысутнічаю на здымках выпуску, дзе ў галоўных ролях — Феечка, Буслік і Топа. Думаю, нікога не трэба знаёміць з гэтымі героямі «Калыханкі», але на ўсялякі выпадак хачу патлумачыць, што Буслік і Мішка Топа — лялечныя персанажы. Іх ролі выконваюць прафесійныя акцёры. Падчас здымак яны

знаходзяцца пад сталом — на жаль, мне не дазволілі зафіксаваць гэты момант камерай. Нягледзячы на тое, што мы не бачым твары акцёраў, іх міміка актыўна працуе.

У працэсе запісу робяцца паўзы, каб рэжысёр і аператар маглі змяніць план для відэа. У адным з такіх перапынкаў пачала гучаць знаёмая з дзяцінства мелодыя: «Баю-бай, баю-бай, вачаняты закрывай» — гэта ў нашага галоўнага героя, Топы, зазваніў тэлефон. Адразу зразумела: акцёр душой адданы сваёй справе.

На запіс адной серыі патрэбна каля гадзіны, хоць мы на экране бачым ўсяго дзесяць хвілін. Першы на сёння эпізод зняты, і ў мяне нарэшце з'яўляецца магчымасць пагаварыць з героем.

Вобраз Мядзведзіка Топы неразрыўна звязаны з жыццём Уладзіміра Міхайлавіча: за трыццаць гадоў яны сталі адзіным цэлым. Сын і ўнучка вельмі ганарацца сваім бацькам і дзедам. «Марыяна (унучка) сябруе з Топам. Часам можа прыйсці, распавесці яму пра свае праблемы, паскардзіцца на маму, тату і нават дзядулю. Гэта наогул такі хітры ход у выхаванні, дзеці вельмі давяраюць Топу».

На думку акцёра, каб адчуваць сябе добра ў такой ролі, важна быць у душы казачнікам. І я ахвотна веру, бо з якім іншым душэўным настроем можна прасядзець пад сталом у позе лотаса трыццаць гадоў, дорачы дзецям казку?

Лялька Топа ўжо чацвёртая, яе стараюцца замяняць раз у дзесяць гадоў. Нязменным застаецца толькі Уладзімір Міхайлавіч.

З якімі ілюзіямі ў жыцці вам прыйшлося развітацца?

— Хто вам праўду скажа? Як я магу развітацца з ілюзіямі? Я б пад сталом не сядзеў, калі б развітаўся. Мне камфортна ў тым свеце дзяцінства, у якім я «сяджу» страшна казаць колькі гадоў. Не хочацца яго ні на што абменьваць, і ён наогул не перашкаджае рэальнаму жыццю. Таму калі з чымсьці даводзіцца развітвацца — гэта непрыкметная ілюзія, на яе не звяртаеш увагі. А ў глабальным маштабе я ў свеце дзяцінства знаходжуся да гэтага часу.

Цікаўлюся ў яго пра неспадзяванкі, якія адбываюцца падчас стварэння перадачы, і ён, нічога не хаваючы, дзеліцца: «Ведаеце, у адным выпуску Топа не ўмее чытаць, а ў іншым ужо праводзіць хімічныя эксперыменты і добра ведае карту зорнага неба. За трыццаць гадоў Мядзведзя чатыры разы ў першы клас праводзілі, і кожнае дзесяцігоддзе ўсё спачатку — для новага пакалення». Пытаюся, ці не стаміўся наш герой ад свайго ладу жыцця, але акцёр прызнаецца, што здымкі займаюць усяго два дні на тыдзень, таму руціны няма і прычын стамляцца таксама. Да таго ж Уладзімір Міхайлавіч пастаянна ўдзельнічае ў розных тэатральных праектах і здымаецца ў кіно.

Пакуль мы размаўляем з Уладзімірам Варанковым, Алена Гіронак (Буслік) прапануе рэжысёру і мастаку-пастаноўшчыку розныя ўпрыгожванні, якія яна прынесла спецыяльна для свайго героя. Акцёры любяць сваіх лялечных сяброў і актыўна ўдзельнічаюць у дапрацоўцы іх вобразаў.

На здымачную пляцоўку паступова прыходзяць новыя персанажы — усе рыхтуюцца да працы над наступным эпізодам. А мне на сёння казачнай «дозы» дастаткова. Уладзімір Міхайлавіч падводзіць вынік: «Вось так бывае: хобі становіцца паўнавартаснай часткай жыцця».

Яна Мусвідас

Аўтар рубрыкі Ліна Багданава

Алеся — Аліса: гісторыя по той бок люстэрка

Тая яшчэ прыгажуня — нос бульбінкай, шчокі ва ўсе бакі, вочы...

— Вочы як вочы, — чмыхнула Алеся і, каб канчаткова не расплакацца, адвярнулася ад люстэрка.

Было б на што глядзець!

— І наогул...

Свет, такі прыемны і зручны, такі знаёмы і прадказальны, раптам выкруціўся навыварат. Тое, што здавалася важным, страціла сэнс, каштоўнасці ператварыліся ў незразумелыя ўмоўнасці, а пачуцці — у пустэчу.

Алеся параўнала сябе з Алісай з казкі. Але Алісе было прасцей — казка ёсць казка, хай і сустракаюцца на шляху герояў складанасці, небяспекі і поскудзь. У рэальным жыцці ўсё больш сумна і празаічна. А яшчэ — без вылаза.

Трэці дзень пакут, а ўнутры кіпіць, не перастаючы, атрутная горыч. І не хочацца ні шпацыраваць, ні чаціцца, ні адказваць на СМСкі. Ды і навошта? Усё вакол стала чужым, раздражняльным, агідным. Дом, мама з татам, сяброўкі.

Школа, надвор’е, родны горад. Ды і саму сябе Алеся амаль ненавідзела.

— Дурная тоўстая лупатая гуска!

І рэзкі погляд у люстэрка — ці не змянілася што? Бо раней яна лічыла сябе першай прыгажуняй у класе. Не, не змянілася — ад прыгажуні засталіся адны ўспаміны. Ды і ці была тая прыгажуня? Наўрад ці.

— Уявіла сябе Монікай Белучы! — Алеся скурчыла тварык уласнаму адлюстраванню. — Знайшлася тут каралева прыгажосці раённага маштабу! Час вызваліць трон і перадаць карону больш дастойным. А што ты думала, сяброўка? Вечна будзеш лунаць у прыдуманых аблоках? Даўно трэба спусціцца на зямлю. Нам, звычайным дзяўчаткам, трэба думаць пра вучобу, кар’еру, сям’ю (калі пашанцуе). І няма чаго тут замкі паветраныя выбудоўваць!

— Алесь, ты з кім там размаўляеш? — падала голас мама.

— Сама з сабой! — адрэзала дачка.

— Ты не захварэла? — мама выйшла з гасцінай і заклапочана паглядзела на тое, як змянілася Алеся. Бледная, асунулася, нервовая. Грубіяніць, хаваецца, плача ўпотай.

— Што-небудзь здарылася?

— Ай, адчапіся, мама, не да цябе!

— Не да мяне? Дзяўчынка мая, хто ж дапаможа, калі не мама? Падзяліся, я паспрабую зразумець, нешта параіць. Разам лягчэй з праблемамі спраўляцца.

— Толькі не ў гэтым выпадку!

Алеся рэзка развярнулася, прайшла ў свой пакой і зачыніла дзверы. Мама праводзіла яе позіркам, але трывожыць не стала. Нораў у дачкі выбухны і ўпарты, калі нешта не так, можа і на канфлікт пайсці. Пакуль варта было абмежавацца назіраннем збоку.

Алеся і сама толкам не разумела, адкуль што ўзялося. Магчыма, свет вакол змяніўся або яна змянілася? Або... На апошнім «або» яна спынілася. Занадта цяжка было ўспамінаць. Занадта незразумела і недакладна. Занадта проста і па-дурному…

Паша запрасіў яе на вечарынку ў клуб. Яна загарэлася. Узрадавалася: цяпер іх адносіны будуць развівацца па-новаму: спатканні, танцы ўдваіх, шпацыры па вячэрнім горадзе, абдымкі, пацалункі — усё па-даросламу, па-сапраўднаму.

Яны сустрэліся каля асветленага стыльнымі ліхтарыкамі ўвахода. Пацалаваліся, даволі ўмоўна. Ён працягнуў ёй ружу. Яна панюхала кветку і ўдзячна ўсміхнулася. Ён узяў яе пад локцік і павёў у гардэроб. Міла, паважна, як у кіно. Занялі столік. Танчылі. Спрабавалі забаўныя безалкагольныя кактэйлі. Зноў танцавалі. Паша сустрэў свайго прыяцеля са старой школы. Запрасіў яго з дзяўчынай за свой столік. Потым прапанаваў абмяняцца «дамамі» ў танцы. Алеся не камплексавала — раз так прынята, і чым не магчымасць паназіраць за каханым збоку? Нават цікава. Паблізу ўсё здаецца родным і знаёмым, а здалёк... Яна разгублена адказвала на пытанні Пашынага прыяцеля, ацэньваючы пару, якая танцавала ля сцэны. Дзяўчына цікавіла яе менш за ўсё. Абаяльная, прыгожа апранутая, трымаецца ўпэўнена, актыўная — нічога асаблівага. Павел чамусьці расчараваў. Быццам і паводзіць сябе прыстойна, і выглядае добра. У сэрцы Алесі замерлі пачуцці...

Яна выбачылася перад Пашыным знаёмым, падышла да акна. Тузанула на сябе фортку і адчула свежае паветра. Неяк лепш. Ці наадварот? А ў душы — пустэча.

— Я зразумела б, калі б ён мяне кінуў. Або зрабіў што-небудзь, — прагаварыла Алеся пра сябе.

Яна нават адважылася намаляваць аптымістычныя перспектывы свайго будучага жыцця. Ён — паспяховы бізнесмен з машынай, кватэрай і іншымі прыемнасцямі, адпаведнымі становішчу. Яна — разумніца, прыгажуня, свецкая львіца. Плюс не менш паспяховы фінансіст (яна марыла зрабіць кар'еру ў банку) і шчаслівая матуля дваіх, як мінімум, міленькіх і разумненькіх дзетак. Менавіта гэта яна бачыла як аб'ектыўнае адлюстраванне рэчаіснасці, а не казку. І толькі так! А цяпер што? Разбітыя ночвы, згаслы погляд, падціснутыя вусны — толькі старога са старой для паўнаты ўражання не хапае. Што здарылася? Ах, калі б яна ведала! Зрэшты, веданне было, не хапала ўсведамлення.

Сімпатулька:

— Расчаравалася ў каханым чалавеку? Як мне гэта знаёма! Мама кажа, што я яшчэ не саспела для сапраўднага пачуцця. А сяброўкі ўпэўніваюць, што не ўмею выбіраць. Улюбляюся не ў тых, потым пакутую. Можа, я пустая? Хоць і не дазваляю хлопцам нічога лішняга, з гэтым у мяне строга. А вось сэрцу

не загадаеш. Памятаю сваё першае каханне. Смешна сказаць, гэта яшчэ ў садку адбылося. Звалі яго Ваня. Мы з ім на суседніх ложках у час ціхай гадзіны адпачывалі. Засыналі, узяўшыся за рукі. Ён мне палову сваёй запяканкі аддаваў. Таму што цярпець яе не мог, а я, дурная, радавалася. А потым Ваню ў іншую групу перавялі, я тыдзень плакала, не спала ўдзень. У садок хадзіць не хацела. Але мучылася нядоўга — неўзабаве пераключылася на іншага хлопчыка. Дзяцінства! Так што я табе не проста так спачуваю, а з разуменнем. Толькі на вяртанне пачуццяў не разлічвай. Прыйдуць новыя, да іншага чалавека. Можа, гэта і не каханне было, а так, ілюзія?

Бабуля з пруткамі:

— Вось дзяўчынка мая і выросла. З дзіцячых кніжак, пустых хваляванняў, правільных хлопчыкаў. Цяжка дзецям дарослымі станавіцца. Там спатыкнешся — тут пад халодны дождж трапіш. Так і хочацца пашкадаваць ды палашчыць. А нельга: моладзь яршыстая пайшла. Пакуль гэтыя твае закаханасці будуць пачынацца ды заканчвацца, блізкіх сваіх шкадуй — яны ні ў чым не вінаватыя. Ды і любоў ў іх сапраўдная. Але ў каханне вер. І чакай яго. Калі прыйдзе, сама зразумееш, без усялякіх сумневаў. Не ў паспяховасці чалавека яго сакрэт, не ў прывабнасці і не ў перспектывах. Гэта ЛЁС, без прыкмет, прычын і правіл. Дай Бог табе вартага чалавека пакахаць. На ўсё жыццё.

Вопытны псіхолаг:

— Пачнём з таго, што гаворка ідзе не пра каханне. Пра сімпатыю, магчыма, пра закаханасць. Падлеткам ўласцівая палігамнасць у сімпатыях. Гэтага мы любім за прыгожую прычоску, таго — за разумныя адказы ля дошкі, трэцяга — за вясёлы нораў і г. д. Як адрозніць каханне ад закаханасці або сімпатыі? Пра гэта шмат пішуць на розных псіхалагічных сайтах — пачытай у вольны час. Там жа размешчаныя дзясяткі тэстаў, думаю, табе яны будуць асабліва цікавыя. І адцягнуць ад сумных думак. Калі мы любім чалавека, то прымаем яго такім, які ён ёсць, з усімі недахопамі і станоўчымі рысамі. Тут бы кожную секунду злавіць — атрымаць асалоду ад часу, які можна правесці разам. Каханне не паддаецца планаванню і рэйтынгам — сёння зробім гэта, заўтра дойдзем да таго. Жыццё дорыць магчымасць назапасіць вопыт, патрэніравацца на ўласных памылках і няўдачах. Табе было прыемна і камфортна знаходзіцца побач з выбраннікам? Гэта падсалоджвала жыццё і давала магчымасць будаваць планы на прыгожую годную будучыню. Разам з тым, прагледзеўшы сваю сітуацыю спачатку і да канца яшчэ раз, — пра каханне ты ўспомніла толькі ў фінале. Тады пра якія перажыванні ідзе гаворка? Хіба што пра крушэнне ілюзій. Зусім не абавязкова рэзка перапыняць адносіны. Усё адбудзецца само сабой. У адзін момант малады чалавек зразумее, як ты да яго ставішся, — магчыма, ён будзе рэзкім, несправядлівым. Даруй яму гэта. Успомні свой стан у аналагічнай сітуацыі. Праяві мудрасць. Дарэчы, заставацца сябрамі вам нішто не перашкаджае.

Пастарайся прыйсці ў сябе, вярнуць ранейшы светапогляд. Можаш падзяліцца перажываннямі з мамай, бабуляй або са мной — шчырая размова сцішыць пакуты, а стасункі з блізкімі стануць больш цёплыя і даверлівыя. Азірніся — свет не змяніўся. Ён па-ранейшаму твой. Пакінь сумневы па той бок люстэрка. Настройся на пазітыў.

Фотаздымак на памяць

Гэтую камеру Арцём купіў у ламбардзе. Зайшоў з-за цікаўнасці, убачыў прафесійны апарат за смешныя грошы і купіў.

Фатаграфія была яго справай, і некалькі добрых камер ён ужо меў. Тут жа здзіўляла таннасць рэчы, несумненна, якаснай і дарагой. Мо яна мае схаваны дэфект? Гаспадар ламбарда на гэта паціснуў плячыма. Добра, сёння Арцёма запрасілі папрацаваць на дзіцячым ранішніку, вось і будзе магчымасць праверыць.

— Дзеці, станьце шчыльней, каб усе ўвайшлі ў кадр! — звыкла камандаваў Арцём, гледзячы ў відашукальнік. — А ты што стаіш адзін? Бяжы ў першы рад!

Бледнае дзіця з тварам, які нічога не адлюстроўваў, нават не кранулася. Глядзела ў аб'ектыў соннымі вочкамі-гузікамі. Глухое ці што? А касцюм? Змрочны нейкі для ранішніка…

— Любоў Іванаўна, пасадзіце хлопчыка ў першы рад, час ідзе!

— Усе хлопчыкі сядзяць, — здзівілася выхавальніца. — Вы пра каго?

— Пра таго, хто збоку, у цёмным пінжаку.

Любоў Іванаўна трывожна зірнула на Арцёма. Той уздыхнуў, адарваў позірк ад відашукальніка:

— Вось гэтага… — пачаў і асекся — хлопчыка на месцы не было.

Арцём хутка «настраляў» патрэбную колькасць кадраў, паабяцаў прывезці фатаграфіі праз гадзіну і паехаў на праяўку.

На зваротным шляху, разглядаючы здымкі, Арцём перажыў сапраўдны шок: адзін з кадраў быў цалкам перакрыты тварам таго самага бледнага хлопчыка. Толькі вочкі-гузікі ўжо не здаваліся соннымі, а гарэлі шалёнай злосцю.

Праз дваццаць хвілін Арцём быў у ламбардзе. Гаспадар не здзівіўся, толькі іранічна прыўзняў брыво:

— Ужо здаяце? Так хутка?

— Вы не ўяўляеце, што я зняў на гэтую камеру! — пачаў тлумачыць Арцём.

— Чаму ж не? Уяўляю, — гаспадар дастаў з-пад прылаўка некалькі здымкаў. — Ён?

Арцём прыглядзеўся і сутаргава кіўнуў — ён.

— Самі разумееце: доўга гэты апарат не затрымліваецца ні ў каго.

— А вы не спрабавалі яго асвяціць?

— У царкву насіў. Але бацюшка сказаў, што справа не ў апараце, а ў ёй. У маці гэтага хлопчыка. Пакуль ён жыў, маці не зрабіла ніводнага яго здымка. А калі затануў, захацела, каб на надмагіллі было фота. Няхай сабе і памерлага хлопчыка. І ніхто не мог яе адгаварыць.

— Жах, — скалануўся Арцём. — Тады, напэўна, лепш вярнуць апарат гаспадыні.

— І я так думаў, — уздыхнуў гаспадар ламбарда. — Але месяц таму яна памерла. Суседзі кажуць, што за апошні час яна перабіла ў кватэры ўсе люстэркі і ніколі не расхінала шторы. А калі памерла, у кватэры было шмат мокрых слядоў. Прыкладна трыццаць другога памеру.

Прывід Аркаша

Легенды і паданні, або Што вучні думаюць пра настаўнікаў

У настаўніцкай адной з мінскіх школ — Ляшнеўская Вольга Мікалаеўна, настаўніца сусветнай мастацкай культуры, і Скроцкая Святлана Міхайлаўна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры, дырэктар школы. Размова ідзе пра самае горкае настаўніцкае пакаранне: стэрэатыпы прафесіі паводле меркаванняў вучняў.

В.М.: Не паспела я задаць пытанне пра адметныя рысы творчасці пэўнага перыяду, як мае вучні пачалі пытацца ў мяне пра ўсё, што датычыць таго часу. Нават пра зброю і навуковыя адкрыцці! З чаго ўзнікла думка, што настаўнік павінен ведаць усё?! Няўжо настаўнікі не людзі?.. Напэўна, робаты, ці жывая Вікіпедыя!

С.М.: Не Вікіпедыя, але ведаць трэба шмат. На ўсе пытанні, канешне, не адкажаш, але хоць на палову — варта. Ды і ці адзіная гэта «вялікая думка» ў галовах вучняў? Напрыклад, улюбёны імі выраз: «Усе настаўнікі — зверы». І што працуем мы, толькі каб яны пакутавалі. І што ніхто ніколі не дапаможа. Але ці разумеюць яны, што мы не маем намеру нашкодзіць ці, як кажуць, «засадзіць». Наадварот, вельмі рады дапамагчы.

В.М.: Канешне, дапамагчы не супраць, але і не кожнаму. Калі вучню гэта не трэба, то і ахвота ісці насустрач знікае. А пасля ён кажа: «Хачу «сем», калі сам і на «чатыры» не ведае. Асабліва гэта востра, калі тата ці мама кімсьці важным працуюць. Адразу ведаюць, што казаць. Але гэта няправільна!

С.М.: Усе вучні павінны разумець, што мы, настаўнікі, таксама людзі. Што па-за межамі школы ў нас таксама сваё жыццё. Што нехта з нас любіць спяваць, танцаваць, нават жартаваць. А не толькі бясконца чытаць кніжкі. Што мы не толькі, як ім здаецца, злыя, строгія і акрамя выкладання свайго прадмета ні на што не здольныя. Можам адчуваць тое, што і яны, жыць, як і яны, і проста быць людзьмі: смяяцца, плакаць ці радавацца.

В.М.: Так. Вось на адным з апошніх урокаў пачула: «Усе настаўнікі аднолькавыя: строгія касцюмы, шэрыя колеры». Дык ці праўда гэта? З майго пункту гледжання, канешне, разбэшчанасці быць не павінна, але ўсё ж такі прымета і прыклад стылю ў настаўнікаў быць павінны! Адразу неяк прыйшоў у галаву вонкавы стэрэатып, што настаўнікі заўсёды павінны адрознівацца ад іншых, нават знешне. Напэўна, адзінае адрозненне — гэта жаданне выхоўваць. Прычым усіх і паўсюль. Не толькі дзяцей, але і дарослых. Рэдка калі стрымаешся і не зробіш заўвагу, калі нешта не падабаецца.

С.М.: Тыпам паводзін настаўнікі заўсёды адрозніваліся. І мне гэта даспадобы. Некалі і я ўспрымала настаўнікаў як людзей, якія толькі і робяць, што чытаюць кніжкі. А калі ў бібліятэцы трапіцца кніга пасля настаўніка, у ёй вельмі шмат паметак. Такое адчуванне, што чыталі адразу з алоўкам. Так і на самай справе. І для мяне гэта быў сапраўдны прыклад паводзін. Хутка сама навучылася і закладачкі рабіць, і падкрэсліваць, і патрэбнае адзначаць.

В.М.: Мне, наадварот, падалося, што настаўнік павінен быць рухавым. Няма часу ні старэць, ні марнець. Усё адно неяк неспадзявана знаходзішся ў віры ўсіх спраў. І з часам вучышся рабіць шмат чаго. І дапамагчы шмат чым можаш. Але не ва ўсім, як гэта часта думаюць вучні. Ім заўсёды чамусьці здаецца, што і растлумачыць можна ўсё і адразу. Нібыта толькі яны да ўрокаў рыхтуюцца. Ды і то не ўсе. Але мы таксама да іх рыхтавацца павінны: розныя класы, розны матэрыял, розныя вучні. З найлепшай памяццю адразу ўсё не згадаеш. Але хутка і гэтаму вучышся.

С.М.: А ў якой прафесіі не было стэрэатыпаў? Усё адно, час будзе ісці, спосабы працы мяняцца, а яны застануцца — «лепшыя сябры» настаўнікаў шэрыя касцюмы і строгі выраз твару.

Падслухала Кацярына Тарасава

Кропка апоры



Мудры Сакрат актыўна не пагаджаўся з тым, што ён мудры. «Я ведаю толькі тое, што нічога не ведаю», — казаў філосаф. І насамрэч ён меў рацыю. Бо што такое гэтыя веды? Па сутнасці веды — гэта ўпэўненасць у нечым, вера ў нешта. Што 2+2=4, што паралельныя прамыя не перасякаюцца, што Зямля верціцца-круціцца, што Булгакаў напісаў «Майстра і Маргарыту», а Напалеон прыходзіў у 1812 годзе. Сакрат разумеў, што ўсё можна паставіць пад сумнеў. А праз больш чым тысячагоддзе быў Рэнэ Дэкарт, які пачаў распрацоўваць цэлую сістэму спазнання свету, узяўшы сумнеў за аснову.

У той час навука толькі пачала з'яўляцца. Да гэтага існавалі нейкія розныя вучэнні, погляды, асобныя назіранні. Навука — гэта сістэматызацыя ведаў. Вось

адсюль і зноў узнікла пытанне, што лічыць ведамі. Бэкан, так сказаць, лідэр аднаго з двух асноўных накірункаў, прапанаваў прымаць як веды ўсё, што адчуваецца: чуецца, бачыцца, смакуецца. Гэты метад быў названы эмпірычным і, па сутнасці, меў рацыянальны падмурак. Вось толькі Дэкарт лічыў, што тут няма нічога рацыянальнага, бо сваім вачам верыць часам немэтазгодна. Вочы, вушы, язык, скура могуць аднолькава хлусіць. І ўвогуле ўспрыманне чаго-небудзь нічога не даказвае.

Дэкарт у сваёй працы заявіў, што для таго, каб прыйсці да сапраўдных ведаў, патрэбна адмовіцца ад таго, што мы ведамі называем, то бок, усё паставіць пад сумнеў. Як вынік з рэальнасці ў Дэкарта толькі гэты самы сумнеў і застаўся. Сумнеў як акт мыслення і сам Дэкарт як той, хто гэты акт ажыццяўляе. Быццам атрымаўся вельмі маленечкі свет. Таму прыйшлося рознымі, часам дзіўнымі і нелагічнымі роздумамі адкрыць Бога і перавесці сутнасць рэальнасці з сябе на яго.

Так, у тыя часы было прасцей. Ну, у пэўных выпадках прасцей. Можна было б спаслацца на Біблію і даказаць тэарэму, а зараз неяк не працуюць у навуцы такія спасылкі. То бок, калі гаварыць сур'ёзна, для сучаснага чалавека існуюць толькі ён і яго ўспрыманні. Бо больш ён нічога даказаць не можа. Зразумела, ён можа ўзяць якія-небудзь фізічныя, хімічныя, біялагічныя з'явы, паназіраць за імі, але гэта толькі яго назіранні.

Такія роздумы крыху падобныя да нейкай параноі і прыводзяць нас да саліпсізму. Саліпсізм — гэта філасофская дактрына, заснаваная на сцвярджэнні сябе як адзінага рэальнага праяўлення і адмаўленні існавання навакольнага свету. «Ці рыпіць хвоя, калі ў лесе нікога няма?» Саліпсісты ўпэўнена адказваюць: «Не». Дадаючы, што, калі ў лесе нікога няма, то, магчыма, і лесу ў гэты час няма.

Дадзеную сістэму немагчыма абвергнуць, як немагчыма і даказаць. Застаецца толькі згадзіцца з тым, што ілюзія вакол ці сапраўднае жыццё, мы павінны гуляць па тых правілах, якія маем. Што 2+2=4. Што Зямля круціцца-верціцца. Бо каб не згубіцца, нам патрэбна апора. І няхай гэта будзе вера ў рэальнасць рэальнасці.

Дзмітрый Шулюк

На мяжы сапраўднасці

Як казаў Леў Талстой, «у мары ёсць бок, лепшы за рэчаіснасць, у рэчаіснасці ёсць бок, лепшы за мары». Поўным шчасцем было б злучэнне аднаго і другога. Але вельмі важна адрозніваць мары, ілюзіі, фантазіі, уяўленні і выдумкі. Пра што і распавядаюць наступныя фільмы.

«Філосафы: урок выжывання», ЗША — Інданезія, 2013 год.

Апошняя па́ра перад канцом навучальнага года. Прафесар прапануе сваім студэнтам Петры і Джэймсу ўяўны эксперымент — атамную катастрофу. Запас ежы і кісларoду ў бункеры разлічаны на год. І усяго хопіць толькі на дзесяць чалавек. Задача студэнтаў — з дапамогай логікі выбраць людзей пэўных прафесій. На першы погляд — усё проста: трэба вылучаць цесляроў, фермераў, а не дызайнераў або паэтаў, каб выжыць пасля катастрофы. Але гэта толькі на першы погляд…

«Жыццё Пі», ЗША — Тайвань — Вялікабрытанія, 2012 год.

Сям'я Пісіна Патэля, у якой быў свой заапарк, вымушана іміграваць з Індыі ў Канаду, але карабель церпіць крушэнне. Пі апынаецца ў адной шлюпцы з тыграм, гіенай, зебрай і арангутанам. Выжылі толькі тыгр і хлопчык, якія разам перанеслі шмат небяспек. Да Пі ў бальніцу прыходзяць прадстаўнікі карабельнай кампаніі, і ён распавядае ім сваю гісторыю. Тыя не вераць яму. Тады Пі расказвае ім другі варыянт таго, што адбылося: замяняе жывёл на людзей з карабля, але пры гэтым прытрымліваецца першапачатковага сюжэта. А праз шмат гадоў да Пісіна Патэля прыходзіць пісьменнік, і той распавядае яму дзве гісторыі. Пісьменнік верыць першай…

«Пачатак», ЗША — Вялікабрытанія, 2010 год.

Навыкі і веды Коба зрабілі яго злодзеем вышэйшага класа, які крадзе інфармацыю з глыбінь падсвядомасці падчас сну, і забойцам, вымушаным уцякаць

ад правасуддзя. Уплывовы багач Сайта просіць яго «ўвесці» ў розум свайго канкурэнта Фішэра ідэю разбурыць асабістую кампанію. Узамен Коб атрымаў бы памілаванне і вярнуўся дадому. Па сутнасці, падаць ідэю, каб розум вырашыў, нібы яна яго, — немагчыма, але Коб ўжо рабіў такое. Тры ўзроўні сну, і ў кожным — свае небяспекі. Але як жа лёгка заблытацца, дзе рэальнасць, а дзе сон! Асабліва, калі рэальнасць становіцца сном.

«Герой», Кітай — Ганконг, 2002 год.

Фільм складаецца з трох звязаных паміж сабой гісторый. Імператар прызначыў ўзнагароду за галовы сваіх ворагаў — Зламанага мяча, Лятучага снега і Неба. У палац прыходзіць Безназоўны, сцвярджаючы, што забіў ўсіх траіх, і расказвае тры гісторыі. Першая — чырвоная — хлусня, ўяўленне. Безназоўны гаворыць пра паядынкі як пра выдумку, якую не адрозніць ад праўды. Другая — блакітная — зман. Імператар не верыць яму і распавядае сваю версію падзей, якая, на яго думку, больш падобная да праўды. І толькі трэцяя гісторыя — белая — сапраўдная.

«Гэта выдатнае жыццё», ЗША, 1946 год.

Яшчэ ў дзяцінстве Джордж Бейлі выратаваў місіс Блэйд ад атручвання, брата — з-пад льду. Ужо дарослым ён працуе ў банку, мае прыгажуню-жонку і дваіх дзяцей і ўсё яшчэ дапамагае людзям і спрабуе выратаваць горад ад забудоў пад казіно і гасцініцы. На жаль, Джордж не разумее, як шмат ён зрабіў і як шмат мае. Крызіс у банку даводзіць яго да роспачы, і мужчына вырашае скончыць жыццё самагубствам. На шчасце, анёл-захавальнік паказаў яму свет без Джорджа Бейлі. І карціна была жудаснай...

Марыя Шчыпанава

Дзяўчынка з палароідам

«Life Is Strange» — дэтэктыўная гульня з элементамі прыгод у жанры інтэрактыўнага кіно. Яна складаецца з пяці эпізодаў, выпушчаных у перыяд са студзеня па кастрычнік 2015 года.

Дзеянні адбываюцца ў кастрычніку 2013 года. Праз пяць гадоў Макс Колфілд (адсылка да кнігі Джэрома Сэлінджэра «Над бездаННю ў жыце») вяртаецца ў родны горад Аркадыя Бэй у штаце Арэгон. Яе прынялі ў прэстыжную акадэмію Блэквэл, дзе чытаюць курс фатаграфіі. Гульня пачынаецца з тарнада, які вось-вось знішчыць горад. Нечакана Макс прачынаецца ў класе і разумее, што гэта быў толькі сон. Але дзяўчынка адначасова ўсведамляе, што атрымала здольнасць перамотваць час на невялікі адрэзак. Разам са сваёй лепшай сяброўкай Хлоей Макс будзе расследаваць знікненне аднакурсніцы і паступова адкрые новыя магчымасці свайго дару. Акрамя перамоткі часу яна навучыцца падарожнічаць у мінулае праз фатаграфіі, як у фільме «Эфект матыля». Але нічым добрым падарожжы ў часе не заканчваюцца: чым больш Макс карыстаецца сваім дарам, тым мацней гэта ўплывае на клімат і ў выніку выклікае тарнада.

У «Life is Strange» прыемна гуляць з-за яе інтэрактыўнасці. Цікава вывучаць асяроддзе графічнага свету: разглядаць постэры, рабіць фатаграфіі, заўважаць дэталі. Ігрок можа размаўляць з другараднымі персанажамі, атрымліваць ад іх парады. Макс каментуе кожную дробязь, вядзе дзённік, праз зносіны з ёй раскрываюцца і астатнія героі. Здольнасць перамотваць час дае магчымасць праглядзець усе даступныя варыянты падзей і выбраць найбольш прыдатныя, а таксама даведацца новую інфармацыю. І кожны раз, калі трэба выбіраць рэпліку, чакаеш, як адрэагуюць на яе персанажы. А вось каб шораз не слухаць адны і тыя ж дыялогі, размову можна прапусціць.

У апошнім, пятым, эпізодзе тарнада вось-вось знішчыць Аркадыя Бэй. Макс трэба зрабіць цяжкі выбар: выратаваць лепшую сяброўку Хлою або горад. Пры гэтым і той, і іншы варыянт руйнуе яе дасягненні. Атрымліваецца, што ўсе сюжэтныя лініі, выбудаваныя адносіны, прынятыя дзяўчынкай рашэнні не маюць значэння. Абедзве канцоўкі кароткія і пустыя.

Нягледзячы на гэты недахоп, гульня сапраўды зацягвае. Моцны сюжэт, цікавыя героі, адсылкі да кніг і фільмаў, падарожжа ў часе выклікаюць жаданне прайсці гульню зноў.

Марыя Шчыпанава

Рэзервацыя гульняў

Ці шмат камп'ютарных гульняў вы бачылі на беларускай мове? А калі і бачылі, то ці задумваліся, хто займаецца іх перакладам? Аляксандр Шумскі, заснавальнік суполкі перакладчыкаў МТГ «RэZэрвацыЯ», — чалавек, які прыклаў руку літаральна да ўсіх афіцыйных лакалізацый гульняў на беларускую мову і зрабіў шмат чаго іншага!

— Як ты прыйшоў да гэтай справы, як шукаў аднадумцаў?

— Усё пачалося выпадкова: адзін з маіх сяброў прапанаваў перакласці які-небудзь фільм на беларускую мову. З ім і пачыналі. А цяпер у нашых шэрагах цеплатэхнік, практыкуючы хірург, легенда беларускай метал-сцэны, фізік-ядзершчык (і гэта далёка не ўсе ўдзельнікі суполкі!), якія раскіданы па ўсім свеце — ад Славакіі да Карэі. Кажуць, падобнае цягнецца да падобнага, і я з гэтым згаджуся. Варта нечым заняцца — і аднадумцы самі знойдуцца.

— Што азначае назва суполкі? Пэўна, нейкая іронія над сучасным станам беларускай мовы?

— З аднаго боку, назва паходзіць ад лацінскага reservo — «захоўваю», а з другога — ад радка песні «Еўрапейскія апачы» гурту DeVIAtion: «Вы пабудуйце рэзерваты — хоць будзе з кім паразмаўляць». А што да трох незразумелых літар напачатку, то мы падумалі, што наўкол ўсе сур'ёзныя канторы маюць у назве розныя ААТ, ЛТД і іншыя незразумелыя абрэвіятуры, а чым мы за іх горшыя? Пачухаўшы патыліцу, мы і дадалі да назвы прыдомак МТГ, яго можна расшыфроўваць як заўгодна — напрыклад, «моладзевая творчая грамада».

— З якіх праектаў вы пачыналі?

— Першым праектам былі беларускія субтытры да «Дружыны пярсцёнкаў» — першай часткі экранізацыі трылогіі «Уладара пярсцёнкаў». З 2004 па 2006 гады

стварылі субтытры недзе да дзесяці кіна- і мультфільмаў. Акрамя гэтага, ішла праца над перакладам гульні Thief: The Deadly Shadows, які быў завершаны недзе на 90 працэнтаў, але, на жаль, цяпер незваротна страчаны.

— А пасля ўзяліся за больш сур'ёзныя гульні?

— Пасля 2006 года для RэZэрвацыI настаў перыяд заняпаду — з-за бяздзейнасці яна перастала існаваць. А тут мне выпадкова падкінулі спасылку на допіс на адным форуме, які шукаў ахвочых узяць удзел у лакалізацыі гульні The Elder Scrolls 4: Oblivion — каманда энтузіястаў-перакладчыкаў «нарадзілася і жыла» на форуме газеты «Виртуальные Радости», да іх я і далучыўся кансультантам. Праца кіпела, з часам энтузіязм удзельнікаў згас, і апошнюю збеларусізаваную версію дапрацоўваў адзін я. Далей было некалькі ненароджаных праектаў (нават збіраліся брацца за «Ведзьмака»), пакуль у чэрвені 2012 года адзін з заўсёднікаў таго форуму не прапанаваў мне зрабіць беларусізацыю World of Tanks.

Другое нараджэнне RэZэрвацыI і звязана з маім жаданнем зрабіць і выпусціць беларусізацыю (хай і неафіцыйную) Diablo III раней за выхад рускай версіі — гэта была б інфанагода, якая б ускалыхнула свет. Але хоць працэс перакладу Diablo III ішоў досыць прадукцыйна, на пэўным этапе выявілася: ёсць небяспека, што карыстальнікам неафіцыйна збеларусізаванай версіі не забаняць доступ у гульню. Гэтак падстаўляць гульцоў я не мог, і праект беларусізацыі Diablo III быў закрыты. А далей ад бяздзейнасці пачалі свярбець рукі, і я ўспомніў пра прапанову перакладу Танкаў.

— І як адрэагаваў Wargaming?

— Як кажуць фізікі, ім было індыферэнтна. Мы зрабілі неафіцыйную беларусізацыю, потым — неафіцыйную агучку, у якой, дарэчы, камандзір экіпажа танка гаворыць голасам Леслі Найфа, вакаліста легендарнага гурту Gods Tower (за што яму вялікі дзякуй), распаўсюджвалі лакалізацыю праз розныя мод-пакі (неафіцыйныя зборкі касметычных змен гульні)…

Канешне, мы не раз спрабавалі дастукацца да распрацоўшчыкаў гульні: публікавалі на форуме гэткі «ліст ад казакоў турэцкаму хану» — адкрыты зварот ад гульцоў Беларусі і Украіны, які быў першай гістарычна зафіксаванай спробай супольнасці «прадавіць» у гульню беларускую (а за адным разам і ўкраінскую) лакалізацыю; у жывым эфіры падкаста задавалі пытанні генеральнаму дырэктару Віктару Кісламу, публікаваліся ў інтэрнэт-СМІ. І, відаць, нарэшце гэта падзейнічала, і Wargaming прапанаваў нам супрацоўніцтва.

— Што з таго часу перакладзена?

— Афіцыйна для Wargaming перакладзеныя World of Tanks і World of Warships — то бок, беларусізацыя ёсць у складзе гульні, і гульцу нічога ніадкуль дадаткова спампоўваць і ўсталёўваць не трэба. Гэтакая ж сітуацыя і з «Легендамі Айзэнвальда» — абедзьве гульні гэтай серыі маюць афіцыйную беларусізацыю ад нас.

Канешне, не заўсёды можна дамовіцца наконт дадавання лакалізацыі ў гульню афіцыйна — пераклад WarThunder даўно гатовы (яго можна знайсці і спампаваць

у сеціве), але, нягледзячы на абяцанні распрацоўшчыкаў, у склад гульні ён дагэтуль так і не трапіў.

Ну, і здараецца, што з нечым не ўгадаў, — мы зрабілі неафіцыйную беларусізацыю World of Warplanes і колькі абнаўленняў падтрымлівалі яе, але з-за малой папулярнасці самой гульні гэты праект быў замарожаны.

— Акрамя вас хто-небудзь яшчэ займаецца беларускамоўнымі лакалізацыямі?

— Больш-менш прафесійна, пастаянна і з дамоўленасцю аб уключэнні лакалізацыі ў афіцыйны склад гульні — на жаль, не. Часам адзіночка ці група людзей бярэцца за беларусізацыю гульні, якая ім даспадобы, часам нават даводзіць пераклад да «ядомага» стану, а, здараецца, і да завяршэння. У такіх выпадках, каб падтрымаць стваральнікаў лакалізацыі і распаўсюдзіць інфармацыю пра вынік, мы публікуем навіны ў нашай групе ў «УКантакце». Шкада, што такія навіны даводзіцца публікаваць даволі рэдка.

— Няўжо ахвочых няма?

— Прычын некалькі.

Аматару, каб зрабіць якасную лакалізацыю, патрабуецца досыць многа вольнага часу і сіл. Мала таго, што гэта не прынясе ніякага прыбытку, але можа і выклікаць выдаткі, часам даволі сур'ёзныя. А прафесійным перакладчыкам часцей за ўсё прасцей працаваць па праверанай схеме (напрыклад, перакладаць на рускую ці англійскую) і не дурыць сабе галаву прыгодамі. Гэта раз.

Два — рынак беларусізацый вельмі малады і даволі невялікі, але ён упэўнена пашыраецца. На ім ужо знаходзяцца сусветныя гіганты — Microsoft, Samsung і Google (смартфоны і спадарожныя сэрвісы), і не толькі яны. Як кажуць, не за дзень Вільня станавілася.

Ну, і трэцяе — праблема не толькі стварыць беларусізацыю, але і даставіць яе патэнцыйнаму спажыўцу. Беларусам у гэтай справе вельмі дапамог Steam — сэрвіс лічбавай дыстрыбуцыі, але і тут усё не слава Богу: зараз у ім няма падтрымкі беларускай мовы, адпаведна і ў гульнях, якія распаўсюджваюцца праз Steam, тэхнічна нельга ўказаць беларускую мову. Але зараз мы пакрысе займаемся перакладам гэтага сэрвісу.

— І вось табе пашанцавала звярнуцца непасрэдна да аўдыторыі «Бярозкі». Што ты маеш ёй сказаць?

— Сіла слова — наймацнейшая ў свеце. Хочаце больш беларусізацый? Не бянтэжцеся і прасіце іх: на форумах вытворцаў гульняў, у групах сацсетак — паўсюль. Без гэтага яны, мабыць, і не з'явяцца ніколі.

А таксама заставайцеся на зваротнай сувязі: пішыце водгукі, рэпосціце навіны ў УК і проста неяк рэагуйце на ўсё, што адбываецца, — мы (і не толькі мы) робім гэта дзеля вас, і нам вельмі прыемна бачыць, што вынікі нашай працы не ідуць у пустэчу.

Мікалай Ізаітка

Фота прадастаўлена парталам onliner.by

Лісты да хрэсніка

Добры дзень, мой дарагі хрэснік!

Твой апошні ліст закрануў мяне адным «простым» пытаннем: «Чаму за мяжой людзі ўсмешлівыя, а ў нас панурыя і незадаволеныя?»

Прычынай кепскага настрою часта бываюць стрэсы, шалёны рытм гарадскога жыцця і крызісы: палітычныя, эканамічныя, узроставыя. Толькі і чуваць: у сына — крызіс пераходнага ўзросту, у мужа — крызіс сярэдніх гадоў, а дзед выйшаў на пенсію і таксама знаходзіцца ў крызісе. Эпідэмія нейкая!

Мой муж лічыць, што крызіс адзін — у галовах. Тут я з ім згодная. Проста людзі не цэняць тое, што маюць. Апостал Павел у сваім пасланні (1-е Цім. 6:6) ад імя Госпада кажа: «Вялікі набытак — быць набожным і задаволеным». Быць задаволеным — значыць, быць удзячным Богу за ўсё, што мы маем у жыцці. Ты маеш сям'ю — дзякуй Богу! Колькі людзей пазбаўленыя гэтага шчасця! Ты жывеш у добрай сучаснай кватэры — дзякуй Богу! Мільёны людзей засталіся без даху пасля прыродных катаклізмаў або ваенных канфліктаў. Ты дасыта еш кожны дзень — дзякуй Богу! Шмат хто на нашай планеце галадае. У нас вады — хоць заліся, а недзе чыстая пітная вада — вялікая каштоўнасць…

Што значыць быць задаволеным? Уяві, што ў твой мяшок сыплюць зерне: вось донца закрылася, вось да сярэдзінкі насыпалі, даверху, больш няма куды сыпаць. «Досыць!» — крычыш ты. Так і ў жыцці. Каму хапае — той і задаволены. Адзін і ў багацці пакутуе ад сквапнасці і зайздрасці, і ўсё яго раздражняе, вечна яму нечага не стае. А другі ўсім задаволены, за кожную драбязу ўдзячны людзям і Богу.

Гасподзь пакінуў нам у Нагорнай пропаведзі запаведзі блажэнства. Блажэнныя (шчаслівыя) тыя людзі, якія спадзяюцца на Бога, міласцівыя, пакорлівыя, шукальнікі праўды, чыстыя сэрцам… Але каб ачысціць сэрца ад граху, патрэбна жыццё. Тэмпераментнаму чалавеку складана стрымаць эмоцыі і навучыцца пакорлівасці. Але быць удзячным можа кожны. У кожнага ёсць здольнасці і магчымасці за ўсё і паўсюль дзякаваць Богу.

Апостал Павел так вучыць: «Ці ясце вы, ці п'яце, ці іншае што робіце, усё рабіце дзеля славы Божай». Усё рабіць дзеля славы Божай — значыць, рабіць усё, славячы Бога і дзякуючы Яму.

Згадзіся, мой харошы, што за дабро, якое Бог паслаў, лёгка ўзносіць Яму хвалу. Калі ўдзячнасць перапаўняе мяне, я чытаю акафіст «Слава Богу за ўсё» — такі ўзвышаны, такі прыгожы! А ў дні, калі няўдачы навальваюцца і здаецца, што ўсё ідзе не так, як трэба, перачытваю духоўны твор прападобнага Серафіма Вырыцкага «Ад мяне гэта было». Гэта адкрыццё голасу Божага, размова Бога з душой чалавека. Перачытваю і яшчэ больш дзякую Богу, бо разумею: усё, што Ён пасылае, патрэбна мне для майго шчасця. І ты ўсе перашкоды і цяжкасці прымай не як прыкрыя замінкі, а як неабходныя ўмовы сталення. Жыццё ставіць задачу. Калі вырашаеш яе, робішся мацней. Калі ўхіляешся ад рашэння, адкладваеш або вырашаеш няправільна, тады зноў і зноў атрымліваеш падобныя задачы. І так да той пары, пакуль не знойдзеш правільны адказ. Таму дзякуй Богу за Яго прадбачлівую любоў: і за радасці, і за цяжкасці. Дзякуй Яму за кожную дробязь, дзякуй за ўсё — шчыра, ад самага сэрца. У хвіліны выпрабаванняў паўтарай кароткую малітву: «Госпадзі Ісусе Хрысце Сыне Божы, слава Табе!» Тады адчуеш, як мір і спакой напоўняць душу. Хочаш быць задаволеным? Заўсёды дабраслаўляй Бога і за ўсё дзякуй яму. Слава Богу за ЎСЁ!

P. S. Калі ў тваім сэрцы ўзнікне жаданне шчыра праславіць Бога і аддзячыць малітвай усе Яго спрыянні, але не будзе хапаць слоў — адкрый Псалтыр. Чытай 102, 106, 144, 145 і 150 псалмы. Гэта гімны-славаслоўі Божай любові.

Беражы цябе Бог, мой бясцэнны.

З любоўю,
твая хросная.

Ад рэдакцыі. Хочаш падзяліцца ўспамінамі пра падзеі свайго жыцця, калі нешта спачатку здавалася катастрофай, а на самай справе апынулася Божай прадбачлівасцю? Запрашаем падзяліцца, чакаем твае ўспаміны.

Прадбачанне Божае

Гасподзь нярэдка дазваляе здарыцца нечаму такому, што прынясе карысць адразу многім людзям. Як правіла, Ён чыніць не адну добрую справу, а некалькі адразу. І Ён ніколі не дазваляе адбывацца злу, калі не ведае, што яно стане прычынай шматлікага дабра. Бог і небяспеку, і нашы пралікі паварочвае нам на карысць. Дабро і зло пераблытаныя адно з адным. Было б лепш, каб яны існавалі паасобку, але ўмяшанне ўласных інтарэсаў людзей пераблытвае іх між сабой. Ды Бог здабывае выгоды для нас нават з такой блытаніны, таму мы не павінны сумнявацца, што Ён дазваляе адбыцца толькі тым падзеям, якія прынясуць карысць, бо любіць Сваё тварэнне. Да прыкладу, Ён папускае нейкую нязначную спакусу дзеля таго, каб пазбавіць нас ад спакусы сур'ёзнай.

З кнігі «Алфавит духовный старца Паисия Святогорца. Избранные советы и наставления». — М.: «Ковчег», 2008.

Прытча

Адзін чалавек, уцалеўшы пасля караблекрушэння, быў закінуты хваляй на маленькі бязлюдны востраў. Адзін ён уцалеў і цяпер бесперапынна маліўся, каб Бог яго выратаваў. Штодня ён узіраўся ў гарызонт ў пошуку судна, якое прыплыве яму на дапамогу.

Канчаткова стаміўшыся гэта рабіць, чалавек вырашыў збудаваць невялікі шалаш з плаваючых бярвёнаў, каб абараніцца ад дажджу і звяроў.

Аднойчы, вярнуўшыся «дамоў» пасля пошуку ежы, ён знайшоў свой шалаш, ахутаны полымем: дым уздымаўся слупом да неба. Самым жудасным аказалася тое, што ўсе яго запасы былі страчаны, ён застаўся ні з чым.

Чалавек не змог стрымаць ні адчаю, ні гневу.

— Божа, як Ты мог так са мной абысціся? — галасіў ён.

А ранкам наступнага дня яго пабудзіў карабельны гудок. Карабель прыплыў, каб яго выратаваць.

— Як вы даведаліся, што я тут? — спытаў чалавек матросаў.

— Мы ўбачылі твой дымавы сігнал, — адказалі яны.

Помні, чалавек: калі наступным разам твой маленькі шалаш згарыць дашчэнту, гэта можа быць дымавым сігналам, які сам Бог паслаў для твайго выратавання.

Нікога Бог не адбірае

З гісторыі мы ведаем, што спачатку на землях Русі панавала паганства, людзі верылі ў розных багоў, пакланяліся ім, прыносілі дары і ахвяры, у тым ліку чалавечыя.

Пасля 988 года людзі пачалі трымацца запаветаў Божых, верыць ў Бога і Яго магутнасць, спадзявацца на Яго. Прайшло больш за тысячу гадоў, а хрысціянскія каноны ўсё перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Раней усе верылі ў Бога, і гэта не было нешта абстрактнае, а з'яўлялася самім жыццём: добрыя ўчынкі, штодзённая малітва, пост не дзеля дыеты, а як праяўленне пашаны да Бога. Канешне, людзі парушалі запаветы, але (і гэта галоўнае) разумелі, што робяць дрэнна. Ніхто не казаў, што не верыць у Бога, а тым больш, што Яго няма.

Зараз шмат людзей называе сябе атэістамі. Яны не вераць у Бога, але большасць з іх верыць у звышсілу, якую мае у сваёй галаве. Іх багамі могуць з'яўляцца і людзі: навукоўцы, філосафы, знакамітасці.

Атэісты сваімі паводзінамі, учынкамі, словамі вельмі-вельмі падобныя да веруючых. У мяне ёсць знаёмы, які кажа, што не верыць у Бога, не адзначае па-хрысціянску святы, але не адмаўляе і той факт, што ёсць пэўная сіла, якая яму дапамагае ў жыцці, якая яго абараняе і вельмі ўважліва сочыць за яго ўчынкамі і адзначае іх. Гэты чалавек шмат добрага робіць для людзей, якія знаходзяцца побач з ім.

Сучасныя хрысціяне — вельмі цікавыя людзі. Наведваючы храм, яны аддана моляцца, спяваюць, і таму бачыць іх — адно захапленне. Але бывае і так, што за парогам святога месца з імі адбываюцца метамарфозы — яны не пацвярджаюць учынкамі тое, аб чым некалькі хвілін таму пачулі ў храме.

Калісьці я сябравала з дзяўчынай, з якой пазнаёмілася ў касцёле, разам былі на імшах, спявалі ў хоры і хадзілі ў пілігрымы. Здавалася, нашы стасункі захаваюцца на ўсё жыццё, бо аб'яднаў нас Бог. Пазней я паступіла ў ВНУ і пачала хадзіць у іншы касцёл — сяброўства паціху згасла.

Казаць, што атэісты — дрэнныя людзі, таму што не вераць у Бога, няправільна. Чалавека робіць чалавекам не толькі вера, а і ўчынкі. Словы, сказаныя ў адпаведнай сітуацыі і ў адпаведны час, могуць стаць лепшай падтрымкай. Таму нават самы няверуючы чалавек можа быць сапраўдным хрысціянінам. Яму толькі перашкаджае гэта зразумець ілюзія нявер'я…

Настасся Капцава

Літаратурная «трэнажорка»

Часам здараецца, што любімы персанаж кнігі ці фільма дзейнічае не так, як нам хочацца. Раней мы думалі, што выправіць гэта можа толькі аўтар або сцэнарыст. Але ўсё змянілася са з'яўленнем вельмі папулярнага літаратурнага кірунку — фанфікшн. Слова пайшло ад англійскага Fan fiction — фан-літаратура і абазначае аматарскае сачыненне па матывах арыгінальнага твора (кнігі, фільма, серыяла, мульціка, комікса, камп'ютарнай гульні). Фанфікі сталі настолькі папулярныя ва ўсім свеце, што быў створаны нават спецыяльны сайт ficbook.com, на якім кожны можа апублікаваць сваю работу, атрымаць водгукі і ацэнкі чытачоў. І неверагодная колькасць разнавіднасцей фанфікаў: па адпаведнасці арыгіналу, спосабу стварэння, сюжэце, характары адносінаў паміж героямі, памеры і гэтак далей. З'явілася новае паняцце «фандом» — нефармальная супольнасць, аб'яднаная цікавасцю да пэўнага твора.

Я пачала пісаць фанфікі, нават не ведаючы такога тэрміну. Мне было трынаццаць гадоў, і я была заўзятым фанатам сагі пра Гары Потэра. Памятаю, як на ўроку фізікі стала запісваць дыялогі, якія прыйшлі ў галаву, паміж Альбусам Дамблдарам і Мінервай МакГонагал. За час, што мінуў, мне давялося пабываць у розных фандомах, пазнаёміцца са шматлікімі цікавымі людзьмі, атрымалася знайсці сяброў-аднадумцаў, напісаць дваццаць чатыры работы

і займець свой круг чытачоў. Фікбук прымае любыя тэмы. Тут кожны зможа знайсці сваё месца і сваю аўдыторыю. Падобная дзейнасць з захаплення перарастае ў хобі і нават працу. Цяпер на фікбуку апублікаваныя 2 102 950 фанфікі па 22 971 фандому!

Аднак варта памятаць, што фанфікі не з'яўляюцца паўнавартаснай літаратурай. Яны — хобі непрафесійных пісьменнікаў і паэтаў, таму на фікбуку ёсць творы з вялікай колькасцю памылак, нецэнзурнай лексікай, парушэннем этычных і маральных норм, бо работы нікім не правяраюцца. У фанфіках не трэба прыдумляць герояў і іх свет, гэта ўсё ўжо апісаў сапраўдны аўтар. Якасны арыгінальны твор чытаецца сам па сабе, але фанфікі без першакрыніцы асаблівай каштоўнасці не маюць. Пры гэтым людзям, якія хочуць у будучыні стаць вядомымі ў літаратуры, яны могуць даць неабходны вопыт.

Хочаце пісаць фанфікі? Вось некалькі парад ад дасведчаных аўтараў.

- Галоўнае — арыгінальнасць сюжэта. Не бойцеся эксперыментаваць, дайце волю фантазіі.
- Героі павінны захоўваць свой характар з арыгінальнага твора. Калі вы не ўпэўненыя, што зможаце яго захаваць, пастаўце папярэджанне — OOC (out of character — «не ў характары»), калі персанаж фанфіка паводзіць сябе не так, як мог бы ў першапачатковым творы.
- Адразу чытачоў прыцягвае правільнае апісанне твора. Не варта пісаць: «Прачытаеце і даведаецеся». Калі зусім нічога не ўдаецца прыдумаць, вазьміце цікавы радок са свайго фанфіка.
- Добрая глава складаецца з 3—10 старонак. Інакш ёсць верагоднасць не паспець раскрыць падзеі і характары герояў або занадта зацягнуць апісанне.
- Перш чым публікаваць частку, перачытайце яе некалькі разоў — гэта дазволіць заўважыць памылкі. Калі веданне мовы недастаткова высокае, можна знайсці бэту — чалавека, які будзе выпраўляць памылкі.
- Не пішыце ў раздзеле «Заўвагі аўтара», што гэта ваша першая праца. Пазбягайце тыповых для пачаткоўцаў выразаў: «Не кідайце пантофлямі, я стараўся», «Я ведаю, што нікому не спадабаецца, але ўсё ж». Гэта даўно збітыя фразы, якія адразу адштурхнуць чытача.
- Не пачынайце фанфікі з таго, як галоўны герой прачнуўся і пайшоў піць гарбату, думаючы пра што-небудзь побытавае, калі далей гэта не сыграе ніякай ролі. Ідэальны варыянт — пачаць адразу з дзеяння, якое задасць твору рытм і інтрыгу.
- Вялікія рэплікі героя лепш разбіваць дзеяннямі, каб не было занадта сумна. Каму цікава чытаць доўгія маналогі і дыялогі?
- Мова аповеду павінна быць багатай і разнастайнай. Старайцеся не дапускаць лексічных паўтораў. Каб не надакучыць чаргаваннем імён герояў і займеннікаў, прыдумайце персанажам 1—2 дадатковыя характарыстыкі ці сінонімы. Напрыклад, Васіль\ ён\ мужчына\ паляўнічы\ вандроўнік.
- Не ганіцеся за высокімі рэйтынгамі. Любы аўтар абавязкова знойдзе свайго чытача. Успрымайце сапраўдную разумную крытыку адэкватна. Гэта толькі палепшыць ваш твор.

У выпуску:

Я ВЕДАЮ МАСТАЦТВА — Партрэт Кшыштафа Весялоўскага

Я ВЕДАЮ МАСТАЦТВА — Творчасць — праява не толькі жыцця

ВІЗУАЛЬНЫЯ НАТАТКІ

Я — МАСТАК
№ 15

Я ведаю мастацтва

Партрэт Кшыштафа Весялоўскага

У канцы XVI стагоддзя ў ВКЛ з'яўляецца Сармацкі партрэт[1]. Нягледзячы на тое, што гістарычныя рэаліі складваюцца так, што выява асобы набывае вялікую каштоўнасць. З выяўленчага жанра партрэт ператвараецца ў інфармацыйны код сваёй эпохі. Часам ён — адзіная дакументальная згадка пра чалавека.

Кшыштаф Весялоўскі быў прадстаўніком шляхецкага роду і значным дзеячам Вялікага Княства Літоўскага. За сваё жыццё займаў розныя дзяржаўныя пасады: стольнік, крайчы, маршалак надворны… Трымаў некалькі старостваў і быў адміністратарам Гарадзенскай эканоміі. Патрэт, які дайшоў да нашых дзён, апавядае пра асобу і эпоху з розных ракурсаў.

У верхнім правым куце размяшчаецца фамільны герб — «Агеньчык». Ніжэй знаходзіцца надпіс, у якім сведчыцца, што на выяве — Кшыштаф Весялоўскі, і пералічваюцца яго пасады. Надпіс зроблены вельмі далікатна, неназойліва і нават пераклікаецца з парчовай тканінай жупана Весялоўскага.

Уражвае сакавіты і надзвычай гарманічны каларыт. Самы светлы тон вызначаецца халодным ружовым, а самы цёмны — гарачым цёмна-шакаладным на накідцы. Суседства гэтых двух тонаў стварае цэнтр фармальнай кампазіцыі, да якой мы вернемся крыху пазней. Большую цікавасць выклікае кампазіцыя колеравая. Канцэнтрацыя самага чыстага і насычанага колеру — чырвонага — знаходзіцца ў правым баку палатна, а самая «палаючая» пляма чырвонага — бліжэй

[1]Сармацкі партрэт — форма параднага рыцарскага партрэта, уласцівая выяўленчаму мастацтву ВКЛ перыяду XVI—XVIII стагоддзяў. Чалавек у такіх творах паказваўся па вызначанай схеме — у парадным адзенні, у атачэнні прадметаў, што не толькі адлюстроўвалі мадэль, яе ўнутраны свет, характар, але і перадавалі прыналежнасць яе да той ці іншай саслоўнай групы насельніцтва.

да ніжняга кута. Гэткі мастацкі прыём — перамяшчэнне колеравага цэнтра да края карціны — вылучае фігуру. Яна аказваецца ў надзвычай прыцягальным інтэр'еры цёплых колераў. Палатно мае патрэбную насычанасць і яркасць, што дазваляе саму фігуру вырашыць у больш вытанчанай гаме. Падкладка накідкі і жупан напісаныя прыкладна ў адным тонавым дыяпазоне, затое тут разгортваецца цэлае поле жывапісных узаемадзеянняў розных колераў. Больш халодная, тэракотавая падкладка стварае тонкае абрамленне для вялікай залатой плоскасці жупана. Як ні дзіўна, але графічна выпісаная парча толькі надае яму жывапіснасці, разнастайваючы цёплую паверхню халоднымі срэбнымі ніткамі.

Верхні левы кут бярэ на сябе неабходную колькасць зялёнага ў палатне, каб выразна «назваць» чырвоныя і залатыя колеры.

Амаль рэалістычна напісаныя твар і рукі. Не назіраецца свабоднага, прафесійнага валодання формай, затое прысутнічае характэрнасць твару. Мы лёгка прачытваем падкрэсленае пачуццё ўласнай годнасці, цвёрдасць характару, шляхецкую адукаванасць і адвагу (левая рука Кшыштафа знаходзіцца над эфесам шаблі).

Адметнасцю гэтага партрэта з'яўляецца спалучэнне аб'ёмнай мадэліроўкі паставы і плоскаснага выяўлення інтэр'ера. Лінейная перспектыва адсутнічае. Кідаецца ў вочы тое, як па-майстэрску выпісаныя адзенне і драпіроўкі, а боты і падлога, наадварот, пададзеныя «наіўна». Тое ж датычыцца і святлоценявай мадэліроўкі — яна выкарыстоўваецца ў выяўленні паставы і адсутнічае у інтэр'еры. Падаючых ценяў няма. Ствараецца эфект «вывернутасці» падлогі і пэўнай міфічнасці сюжэта.

Аўтар выкарыстоўвае некалькі розных па маштабе патэрнаў: самы дробны — на жупане, буйнейшы — на падкладцы накідкі, самы буйны — узор падлогі. Такім чынам свараецца багацце рытмаў на палатне.

Што датычыцца агульнай кампазіцыі твора, то яна будуецца выцягнутым уверх трохкутнікам, які ўсярэдзіне перабіваецца светлымі абрысамі меншага трохкутніка. Вялікая плоскаць залатога колеру перацякае ў насычаную чырвоную пляму справа, што дазваляе кампазіцыі выйсці за палатно, разнявольвае яе і робіць дынамічнай. З левага боку, наадварот, кампазіцыя абмяжоўваецца дзвюма падкрэсленымі вертыкальнымі лініямі — белага футра і посаха. Так ствараецца рух кампазіцыі злева направа, што лёгка ўспрымаецца гледачом. Першым позіркам чалавек разглядае выяву лінейна, «прачытвае» яе злева направа, а потым вяртаецца да астатніх частак.

Партрэт Весялоўскага — каштоўны артэфакт сваёй эпохі. На ім бачныя і мастацкія тэндэнцыі 17 стагоддзе, і спалучэнне рэалістычнай і стылізаванай выявы, і майстэрства, якое сягае не ўсяго палатна, а толькі яго фрагментаў. Але ў гэтым і ёсць унікальнасць твора ў прыватнасці і з'явы Сармацкага партрэта ў цэлым.

Алеся Галота

Партрэт Кшыштафа Весялоўскага (гады жыцця: ? — 19 красавіка 1637 г.), напісаны ў 1636 г., алей, палатно, захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь.
Выява партрэта прадастаўлена Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь.

Творчасць — праява не толькі жыцця

Фота надмагілля

Пачнём хіба здалёк — з усведамлення таго, чым была смерць для людзей, якія жылі раней, але не так даўно, яшчэ мо стагоддзе з нечым таму.

Яна дакладна не была для іх толькі горам, трагедыяй, катастрофай. Мо і гэтым усім не была. Мо зусім гэтым не была. Смерць была падзеяй і з'явай дарэшты высакароднай, прымальнай жывымі цалкам і з той міласцівай пакораю, якая не так спалучалася з пакутамі жывых, як дыктавала ім, жывым, пэўныя сцэнарыі паводзін.

Да пахавання ў дамах знаці рыхтаваліся, як да пышнага свята: адмыслова пісаўся сцэнарый, натхнёна сачыняліся музыка і надмагільныя эпітафіі. Апошнія былі такімі напышліва мудрагелістымі і такім напаўняліся досціпам, што нагадвалі эпіграмы ці панегірыкі. «Прохожий! Ты идёшь, но ляжешь так, как я», — папярэджваў надпіс на магіле XIX стагоддзя, вельмі папулярны і таму шырока распаўсюджаны; «Привет из гроба вам, друзья», — яшчэ і сёння лёгка прачытваецца

Сучасны выгляд Траецкага касцёла ў Росі

на надмагіллі пачатку XX стагоддзя. Цікава, што пахаваны пад гэтым помнікам настаяцель царквы.

Шмат якія эпітафіі сачыняліся самімі ўладальнікамі магіл яшчэ пры жыцці, загадзя. Бо як было ведаць, што напішуць нашчадкі? «Тут пахавана цела Джонатана Свіфта, дэкана гэтага сабора, і суровае абурэнне ўжо не раздзірае яго сэрца. Ідзі, мінак, і пераймай, калі можаш, таго, хто мужна змагаўся за справу свабоды», — напісаў сам для сябе, для сваёй магілы той самы Джонатан Свіфт, для большасці — аўтар прыгод Гулівера, яшчэ за пяць гадоў да сваёй смерці, у агульным тэксце завяшчання. Гэтую эпітафію можна прачытаць па-лацінску ў Саборы святога Патрыка ў Дубліне. Безумоўна, там ён і пахаваны.

Да чаго гэта ўсё? Да таго, што творчасць — праява не толькі жыцця. А ўвогуле, гэты тэкст напісаны з мэтай паказаць, што, па-першае, і надмагіллі могуць уяўляць сабой творы мастацтва, па-другое, што скульптурныя шэдэўры захоўваюцца не толькі ў музеях, па-трэцяе, што ў куточках Беларусі часта «заціхурана» нешта такое, дзеля чаго можна адкласці паездку ў Эрмітаж або Луўр і навастрыць лыжы, скажам, у Рось, што каля Ваўкавыска.

Пра надмагілле Сафіі Пац, размешчанае там у Траецкім касцёле, шмат хто нічога не чуў. Нават у самім мястэчку Рось, нават у аптэцы і краме побач з касцёлам, нават на вуліцы можна спытаць пра яго і не атрымаць уцямнага адказу. «У размешчаным побач з сядзібай класіцыстычным касцёле знаходзіўся прыгожы надмагільны помнік Сафіі Патоцкай-Несялоўскай, выраблены з белага мармуру», — пішацца ў знакамітай кнізе «Гісторыя рэзідэнцый на даўнішніх крэсах



Малюнак Траецкага касцёла, зроблены рукой Вітольда Карпызы

Рэчы Паспалітай» Рамана Афтаназы. Ён і цяпер там знаходзіцца, у бакавым алтары.

Мы ведаем дакладна, які майстра вырабіў гэта беламармуровае надмагілле, — Джуліа Маскеці, ведаем, што замовіла яго італьянцу пляменніца Сафіі Пац (гэта ў дзявоцтве яна была Пац, а пры далейшым жыцці — Сафія Патоцкая-Несялоўская, але дагэтуль вядомая і як Пац), што скульптуру прывезлі ў Рась у 1881 годзе, а гэта значыць, што пляменніца замовіла помнік любай цётачцы праз чвэрць стагоддзя пасля яе смерці і спецыяльна да стагоддзя з дня нараджэння. Бо Сафія Аляксандра Пац нарадзілася ў 1781-м, а памерла ў 1856-м годзе. Траецкі касцёл быў пабудаваны ў 1801-м годзе з грашовай дапамогай самой пані Сафіі, значыць, праглядаецца і трэцяя круглая дата: восем дзясяткаў гадоў з заснавання святыні. У гэтай святыні і ўсталявана мармуровая спячая любая цётачка.

Скульптурны шэдэўр ніколечкі як быццам не пашкоджаны. Падыходзіш да алтара — і бачыш пад тонкай коўдрай кволую жанчыну, якая толькі-толькі прылягла адпачыць. Відаць, выпадкова заснула, стаміўшыся ад нейкай працы. Бо падушка ляжыць не плоска, а прыстаўленая да біла ложка. І шаль на галаве, не зняты, значыць, сапраўды прылягла ненадоўга, гатовая праз колькі хвілін вярнуцца да важных спраў. Правую руку паднесла да сэрца. Тоненькую, паўпразрыстую. На левай руцэ, якая ляжыць уздоўж цела, праглядваюцца напружаныя вены.

Падушку па перыметры ўпрыгожваюць карункі. Карункамі ж аздобленыя і манжэты сукенкі. Тонкая коўдра ці хутчэй плед аблямаваны махрамі. Ложак замест звычайных мэблевых ножак мае лапы нейкага звера — так было модна.

Хто ведае пра гэтую жанчыну больш, чым проста імя і прозвішча, сёе-тое пра фундатарства касцёла і такую вось даўгавечную любоў пляменніцы? Але ёсць упэўненасць у душы, што не магла яна быць нявартай касцёльных спеваў, якія даносяцца штодзень да яе надмагільнага помніка, і касцёльнай цішыні, якая ўсталёўваецца тут пасля службы. Сузіранне спячай Сафіі — надмагілля — прымушае думаць не пра смерць, а выключна пра жыццё з яго магчымасцямі для напружанай працы душы і цела, якая адзіная можа быць нагодай для вечнай памяці.

Святлана Воцінава

Усе літары свету для цябе!

Прывітанне, сябра :o).

У мінулым выпуску я расказвала, што такое візуальныя нататкі і як іх можна выкарыстоўваць. Гэтым разам я распавяду болей пра шрыфты і пра тое, як літары можна не проста пісаць, а маляваць!

Паехалі!

Шрыфты можна выкарыстоўваць

НАБОРНЫЯ — гэта тыя, якія знаходзяцца ў камп'ютары

ці **РУКАПІСНЫЯ** ← я раскажу пра гэты

У асноўным мы звыкліся пісаць усё адным почыркам - манатонна. Почырк у кожнага свой, асаблівы.

Як і ты, сябра :o). -вельмі незвычайны-

Але. Таксама мы можам навучыцца рабіць літары рознымі. Маляваць свае думкі.

Самыя простыя шрыфты гэта вось такія

Адналінейныя.

Назва кажа сама за сябе: мы выкарыстоўваем адну лінію, калі малюем.

Простую лінію і шрыфты можна ўжываць

Гэта самае галоўнае!

Шрыфты вось такія

Двухлінейныя

мы дадаем такую ж самую лінію па ўсёй літары.

Літары можна рабіць таўсцейшымі колькі заўгодна — як падабаецца.

КАЛІ ДА ЛІТАР ДАДАЦЬ

ЗАСЕЧКІ, ТО...

літары пачнуць
выглядаць
строгімі і дзелавымі

Гэта больш падыходзіць да назваў і загалоўкаў.

ЯКІ ЛІТАРЫ ЛЕГЛІНЬМІ

ЖМ

ДАДАВАЙ ЦЕНКІ

УА

МАЛОЙ ЛІТАРЫ

ЯКІЯ ЗАЎГОДНА! СВАБОДА!

МАЕ САМЫЯ ЛЮБІМЫЯ ВОСЬ ГЭТЫЯ

«вельмі люблю гэтыя літары»
«такія таксама люблю»

А якія любіш ты?

Звяртай увагу на прыгожыя афішы, загалоўкі газет, назвы кніг.
Калі нешта падабаецца так, што вачэй не адвесці, —
замалёўвай сабе ў нататнік.

ПАКІДАЙ САБЕ НА ПАМЯЦЬ
ТАК-ТАК —
ЛІТАРЫ! :o)

Заўжды
насіў сабой

І КОЖНЫМ РАЗАМ У ЦЯБЕ БУДЗЕ ЛІТЫМОЎВАЦЦА

УСЁ ЛЕПШ І ЛЕПШ!
Лепш і лепш!
ЯШЧЭ ЛЕПШ!

З вялікай павагай
да цябе, твой сябра
Юля

Дэтэктыў ці хорар?

10 клас

Ідэнтыфікацыя «...Стаха»

«Праз прасеку плывуць смутныя конныя цені. Не бразгочуць мячы, не ржуць маўклівыя коні. Толькі часам аднекуль даносіцца журботны стогн рога. Па верасе, па гіблай дрыгве скача дзікае паляванне караля Стаха». Хто б падумаў, што такую жахлівую гісторыю можна чытаць на «белліце»?

Упершыню аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» была надрукавана ў 1964 годзе ў часопісе «Маладосць»[1]. Больш за паўстагоддзя мінула, а за пісьменнікам Караткевічам замацавалася слава майстра гістарычнага дэтэктыва.

Якія прыкметы гэтага жанру? У першую чаргу — загадкавае злачынства, акалічнасці якога трэба высветліць. За справу бярэцца Андрэй Беларэцкі. Ён рэаліст і адчувае, што дзікае паляванне — не здані, а сапраўдныя зламыснікі, якія хочуць вывесці з раўнавагі Надзею Яноўскую, — гаспадыню маёнтка Балотных Ялін. Дзяўчына сапраўды запалоханая: верыць у родавае праклятце, якое быццам у хуткім часе заб'е яе. Але з'яўленне Андрэя Беларэцкага парушае планы гэтага «праклятцця».

Істотная рыса дэтэктыва — расследаванне. Падчас яго Беларэцкі з сябрамі — Рыгорам і Андрэем Свеціловічам — спрабуюць высветліць акалічнасці смерці бацькі Надзеі. Хто хоча знішчыць *яе*, каму *яна* замінае? Да канца твора, як у добрым дэтэктыве, мы не здагадваемся пра сапраўднага злодзея. Падказкі, праўда, сустракаюцца, але ж нічога не даюць, адно жартуюць. Сапраўднае аблічча зламысніка прыкрыта вобразам клапатлівага сябра…

[1]«Уключым аповесць Алеся Савіцкага пра рабочых і аповесць Уладзіміра Караткевіча пра Стаха на гістарычную тэму», — сказаў рэдактар Міхась Стральцоў 11 снежня 1963 года. Гэтыя словы занатаваныя ў пратаколе пасяджэння рэдакцыйнай калегіі. Можаш, дружа, прыйсці ў рэдакцыю часопіса «Маладосць», што суседнічае з «Бярозкай», і зірнуць на першадрук аповесці ў арыгінале.

Што сімвалізуе сабой «дзікае паляванне»? Носьбіт зла, культу сілы і беспакаранасці. Улады не спрабуюць спыніць яго, бо яно трымае ў паслушэнстве сялян, вобразы якіх Уладзімір Караткевіч апісвае вельмі маляўніча. Чытаеш гэтыя апісанні — і складваецца ўражанне, што ты ў казцы, і перад табой міфічныя істоты, а не людзі. Але гэта людзі, даведзеныя да такога стану нястачай і голадам.

«Дах быў зялёны, тоўсты ад тлустых, пушыстых імхоў. У шэрае акенца ўнутранасць хаты здавалася панурай і занядбанай. Словам, хатка на курыных ножках. Не хапала толькі бабы-ягі… Але хутка з'явілася і яна. У акно на мяне глядзеў твар жанчыны, такі сухі, што здаваўся чэрапам, абцягнутым жоўтай скурай. Сівыя патлы валасоў падалі на плечы. Пасля з'явілася рука, якая ківала мне сухім, як курыная костка, пальцам».

А ці можам мы сказаць, што твор мае прыкметы актуальнага цяпер хорара?

Хорар — жах. Праз увесь твор праходзіць адчуванне праследавання. Або героя праследуюць здані, калі ён, напрыклад, вяртаецца ад дзядзькі Дубатоўка і ўцякае ноччу па багне ад «дзікага палявання», або сам герой выбягае ў пусты калідор, праследуючы Маленькага Чалавека ці Блакітную Жанчыну. Ён не можа спакойна спаць, курчыцца ў ложку ад жаху, даючы сабе слова, што паедзе адсюль, з Балотных Ялін. Аднак яго прымушаюць застацца каханне і гонар шляхціча.

Заўважце: прыезд героя ў маёнтак — класічны пачатак многіх фільмаў жахаў. Персанажы трапляюць у незвычайны дом, дзе адбываюцца дзіўныя падзеі. У гэтым доме жывуць прывіды — Маленькі Чалавек і Блакітная Жанчына.

Як і ў хорары, тут працуе схема «кат—ахвяра». Ахвярай была прыгнечаная жахам Надзея, якая верыла, што хутка памрэ, і не змагалася з такім «лёсам». Пры першай сустрэчы Андрэй Беларэцкі бачыць непрыгожую дзяўчыну і шкадуе яе. Аднак паступова заўважае яе прывабнасць. Паступова разгараецца каханне, і ён прысягае, што разгадае ўсе злавесныя таямніцы наваколля, якія не даюць каханай спакойна жыць. У якасці ка́та выступае «дзікае паляванне караля Стаха» — пракляцце роду сям'і, якое павінна знішчыць усіх нашчадкаў Рамана Яноўскага да дваццатага калена за яго здрадніцтва. Надзея — апошняя з іх.

Заўважце яшчэ: прозвішчы герояў таксама сімвалічныя. Беларэцкі і Свеціловіч з'яўляюцца люстранымі адбіткамі адзін аднаго: падобныя прозвішчы і падобныя ролі, светлыя і жыццесцвярджальныя. А што могуць сімвалізаваць прозвішчы Дубатоўк, Стахевіч, Пацук, Бабаед?

Маюць значэнне і назвы мясцін, дзе адбываюцца падзеі. Балотныя Яліны, Волатава прорва, Халодная Лагчына. Людзі на балоце жывуць замкнёна, адарвана ад наваколля, і Балотныя Яліны атаясамліваюцца ў іх з усім светам. Надзея Яноўская не можа паверыць, што ёсць іншыя месцы, прасякнутыя сонечным святлом, поўныя сакавітай зеляніны. Яе, як і іншых жыхароў, пужае навакольная прырода. Яны баяцца і не любяць балота. Таму і назвы звязаныя з жахам, тванню, дрыгвой.

Аўтар атаясамлівае «дзікае паляванне» з нашай зямлёй. Яна ў Караткевіча разглядаецца на некалькіх узроўнях: Балотныя Яліны, Беларусь, Сусвет. Жах перад зямлёй узнікае ад няведання сваёй гісторыі. «Дзікае паляванне» паралізуе, не дае раскрыцца людзям, таму і краіна для іх — нялюбая.

Якія яшчэ загадкі схаваныя ў творы? Прачытайце аповесць і разгадайце гэтыя таямніцы разам з Андрэем Беларэцкім!

Таццяна Лаўрык

Рэпартаж са Слуцкага КВЗ

З імой вучні першай гімназіі горада Слуцка традыцыйна гуляюць у КВЗ. Сёлетняя гульня атрымалася асаблівай, і галоўная прычына — чатырохсотгадовы юбілей навучальнай установы. Ён стаў нагодай для жартаў. Згадзіцеся, заўсёды прыемна смяяцца з таго, з чым сустракаешся штодзень.

Удзельнічалі дзесяць каманд — вучні з восьмага па адзінаццаты класы. Выступленні былі смешнымі, актуальнымі і цікавымі. Я раскажу пра тыя, што найбольш запомніліся мне.

Каманда «Вогненныя кураняты» 9-га «Б» спадабалася сцэнкамі пра нашу школу. Па-добраму яны жартавалі з любімых настаўнікаў. А калі на сцэне з'явіўся заснавальнік гімназіі Януш Радзівіл, стала немагчыма адвесці вачэй ад дзеянняў. Было цікава назіраць, як для чалавека іншага часу выглядае наша школа і навучанне ў ёй. Герой дзівіўся з сучасных тэхналогій, але застаўся задаволены кемлівасцю вучняў і ўменнем настаўнікаў проста тлумачыць складаныя рэчы.

10-ы «Б» вырашыў забіць двух зайцаў: і гледачоў павесяліць, і атрымаць кабінет, якога яны часова не маюць праз будаўнічыя работы. Таму і назваліся «Валацугі». Іх жарты пра рамонт у нашай гімназіі былі самымі надзённымі. Ніхто не любіць шум і немагчымасць бясстрашна хадзіць па калідорах, але ўсе з нецярпеннем чакаюць, як прыгожа будзе на першым і трэцім паверхах.

Самай арыгінальнай мне падалася назва каманды 10-га «В» класа — «Стомленыя розумам». Я не схлушу, калі скажу, што большасці гледачоў спадабаліся жарты пра школьную форму. З выступлення гэтай каманды мы даведаліся, што можа здарыцца, калі прыйсці аднойчы без яе: цябе проста не пусцяць у будынак.

Выступленне каманды «Юбілейны выпуск» 11-га «А» класа было самым кранальным. Вельмі актуальнымі аказаліся сцэнкі пра экзамены. З іх мы ўсе запомнілі, што рабіць, калі раптам не паспеем падрыхтавацца. Па версіі каманды, можна смела прасіць дапамогі настаўніка ў выбары білета, а пасля паказаць свае веды ва ўсім, акрамя патрэбнага прадмета. Пранікнёная прамова-развітанне

выклікала слёзы не толькі ў тых, хто быў на сцэне, але і ў гледачоў. Каманда шчыра журылася з-за таго, што гэта іх апошні выступ.

Безумоўна, я з хваляваннем сачыла за камандай свайго 11-га «Б» класа «MEN». Назва, відавочна, не адпавядала рэчаіснасці, бо на сцэне быў толькі адзін хлопец. Танец у пачатку выступлення, у якім клас выглядаў як непадзельны арганізм, уразіў гледачоў. На адным школьным перапынку мы знялі відэа славутага «Манекен чэлендж», дзе паказалі, што можа адбывацца ў класе, калі яго не кантралюе настаўнік: дружная фотасесія, бойкі без правіл, нават пераапрананне ў бандытаў. Расшыфроўка назвы каманды — імя дырэктара Міронавай Алены Мікалаеўны — спадабалася і дзецям, і настаўнікам.

Журы ўзнагародзіла ўсіх удзельнікаў, асабліва ж адзначыла 10-ы «В», 11-ыя «А» і «Б» класы. Яны атрымалі смачныя торты. Пасля навагодняга КВЗ усе, хто хацеў, танцавалі на дыскатэцы. Шчыра скажу: у нас сіл не засталося. Такія цёплыя, вясёлыя і атмасферныя мерапрыемствы наша гімназія праводзіць не кожны тыдзень, менавіта таму яны і запамінаюцца надоўга.

Паліна Забела
11 «Б» клас, гімназія № 1, Слуцк

Надрукавана ў «Бярозцы»

Подпіс рэдактара

_____

Адкуль пайшла назва вёскі Росіца

Ёсць у Верхнядзвінскім раёне вёска з даволі незвычайнай назвай — Росіца. Даўно цікавіла мяне паходжанне гэтай назвы. Чаму Росіца? Можа, у ваколіцах гэтай вёскі расы зашмат летнімі ранкамі выпадае? А нядаўна пачула цікавую і падобную да праўды легенду.

У даўнія-даўнія часы ўсё наваколле нашага краю было парушана працяглай вайной, пасля заканчэння якой пачалі вяртацца ў родныя мясціны ўцалеўшыя ваяры. І быў сярод іх адзін, якому вяртацца не было куды. Брыў ён куды вочы глядзяць і раптам ўбачыў на беразе прыгожага возера невялікую вёсачку. Дакладней тое, што засталося ад яе, бо было там ціха і бязлюдна, усё спапялілі і знішчылі, акрамя адной хаціны на самым беразе. У ёй жылі бабуля і ўнучка.

Дзяўчыну звалі Расіцай, і была яна вельмі прыгожай, такой, што ваяр не мог адвесці вачэй. Расіцы хлопец таксама спадабаўся, і ў хуткім часе яны пажаніліся. Хлопец паставіў новую хату, потым побач з імі пачалі зноў сяліцца людзі, але ніхто так і не ўспомніў, як вёска называлася раней. А можа, проста не пажадалі ўспамінаць…

Новую вёску сталі называць Расіца. А потым, паступова, змянілі назву на Росіцу.

Вось такая легенда.

Праўда, ёсць і іншыя меркаванні.

Да прыкладу, многія гісторыкі лічаць, што Росіца — адно з самых старажытных мясцовых паселішч і бярэ сваю назву ад прозвішча першага ўладальніка — Давыда Расіцкага.

Магчыма, гісторыкі маюць рацыю, але ж мне асабіста больш падабаецца легенда пра прыгажуню Расіцу.

Марыя Шкляр,
7 клас, Бігосаўская СШ, Верхнядзвінскі раён

Гэта так цудоўна, калі тваё асабістае свята супадае са святам твайго горада!

У многіх населеных пунктах Беларусі ёсць вуліцы з дзіўнаватай, на першы погляд, назвай — «Вуліца 17-га верасня». Спачатку я не ведала, адкуль такая назва, але на ўроку беларускай літаратуры настаўніца Ніна Фёдараўна

расказала нам аб тым, што азначае дзень 17-га верасня ў нашай гісторыі. Менавіта ў гэты дзень у далёкім 1939 годзе адбылося ўз'яднанне двух частак Беларусі ў адзінае цэлае.

І ведаеце, чаму мне было асабліва цікава гэта пачуць?

Бо якраз у гэты дзень я нарадзілася, але і гэта не ўсё!

Дзень горада Гродна штогод адзначаецца ў трэцюю суботу верасня. А ў 2016 годзе гэта якраз 17-га верасня. Гэта значыць, што і я, і мой родны горад святкавалі свае дні нараджэння ў адзін дзень!

Розніца толькі ў тым, што мне споўнілася 12, а нашай старажытнай Гародні — аж 888 гадоў. Паглядзіце, якая запамінальная дата! Вось і хочацца мне расказаць, якім быў для мяне дзень 17 верасня 2016 года.

Вы, напэўна, чулі пра гродзенскія «Белыя росы»? Іх паўсвету ведае. Дык вось, я займаюся ў дзіцячай харэаграфічнай студыі «Белыя расінкі», і раніцай, калі я прачнулася, мне, як заўсёды ў суботу, трэба было ісці на заняткі ў танцавальным гуртку.

На рэпетыцыі мы добра папрацавалі, бо нам жа трэба было выступаць на святе горада. А дома мяне чакаў сюрпрыз: прыехалі госці — мае сябры-аднакласнікі. Мы добра павесяліліся: з дапамогай дарослых наладзілі гульню — хто лепш ведае гісторыю свайго горада. А прыз — цукерка.

Ваза з цукеркамі апусцела на дзіва хутка, бо ўсе ведалі і Давыда Гарадзенскага, і гісторыю герба (Святога Губерта), і чаму наш самы стары парк носіць імя Жылібера, і дзе знаходзяцца дамы-музеі Максіма Багдановіча і Элізы Ажэшка. Я была нават здзіўлена, як шмат ведаюць мае аднакласнікі пра свой горад. Але пасля згадала, што многія з іх удзельнічалі ў гульнях, прапанаваных напярэдадні свята горада нашай газетай «Вячэрні Гродна». Адна з гульняў была якраз для тых, хто любіць даследаваць Гродна. Газета прапанавала прайсці па гарадскіх вуліцах і знайсці адказы на пэўныя пытанні. А пытанні былі самыя розныя. Напрыклад, знайсці скульптуру, памятную дошку, мясціны і будынкі з цікавай гісторыяй і шмат іншага. Яшчэ ў газеце друкавалі пазлы, з якіх можна было скласці паштоўкі са старымі выявамі нашага горада. Іх трэба было скласці і наклеіць на ліст паперы, а тыя, хто правільна сабраў усе, атрымлівалі прызы. Вось дзякуючы гэтым гульням мы і папоўнілі свае веды аб родным горадзе.

А потым мы з сяброўкамі выступалі ў гарадскім парку на святе. У танцы мы пастараліся выразіць і свой прыўзняты настрой, і гонар за сваю старажытную Гародню.

Столькі было цікавага ў гэты дзень! Мы паспелі наведаць розныя святочныя пляцоўкі, асабліва мне спадабаўся «Горад майстроў». Гэта ж якія цудоўныя рэчы можна стварыць рукамі чалавека! Самым смешным быў конкурс маленькіх гарадзенцаў, якія спаборнічалі ў гонках на дзіцячых веласіпедзіках. А яшчэ можна было паўдзельнічаць у грандыёзным фэсце сыру. Я тады ўпершыню зразумела, што азначае само слова — «фэст».

О, гэта быў сапраўды незабыўны дзень! Як цікава бывае ў жыцці, калі тваё асабістае свята супадае са святам твайго горада, тваёй краіны, і ты адчуваеш тады сябе неад'емнай часткай сваёй роднай зямлі!

Паліна Гурына
6 «Л» клас, гімназія № 2, Гродна

Легенда пра вёску Пералом

На летніх канікулах я часта бываю ў вёсцы, якая мае назву Пералом.

Спачатку я не надавала значэння незвычайнасці гэтай назвы. Вунь колькі вёсак вакол нашай Гародні, і ў кожнай сваё імя. Але калі прачытала ў «Бярозцы» пра вёску Ясень, то вельмі зацікавілася, чаму мая вёска так незвычайна называецца.

Даследаванне пачала з мамы. Яна сказала, што такое найменне нашай вёсцы далі таму, што вельмі даўно ў гэтых мясцінах з'явілася новае рэчышча Нёмана. Ён быццам «пераламаўся» і паплыў новым шляхам.

На наступны дзень я паклікала сяброўак пайсці да Нёмана і паглядзець на той «пералом». Калі мы рушылі ў дарогу, малодшы брацік адной з дзяўчынак прапанаваў залезці на старую ліпу, што расце на ўскрайку вёскі, і паглядзець адтуль. Мы так і зрабілі. Але паглядзець не паспелі, бо нас спыніла нейкая бабулька. Яна баялася, каб мы не звалiліся з дрэва. Я патлумачыла, з якой мэтай мы забраліся так высока, і тады бабулька прапанавала нам злезці і паслухаць, што яна раскажа. Мы паселі пад ліпай, і бабуля пачала свой аповед.

Яна сказала нам, што пачула гэта паданне ад сваёй бабулі, а тая — ад сваёй. Расказвалася ў ім, што даўным-даўно тут быў вялікі луг, ад лесу аж да Нёмана. На ўскрайку лесу знаходзілася хата, і жылі ў ёй муж, жонка, а таксама іх маленькі сынок. Пайшлі яны аднойчы на луг касіць. Пачалі завіхацца ў працы, а дзіця пакінулі ў цяньку пад кустом. Прайшло колькі часу, вырашылі яны паглядзець сынка, пакарміць яго. А калі наблізіліся да месца, дзе пакінулі дзіцятка, то з жахам убачылі, што яго там няма. Кінуліся шукаць. Маці з нямым крыкам пабегла да рэчкі.

Бераг рэчкі быў высокі і круты. Хлопчык дапоўз да самага яго краю. Як убачыла рэчка, што малое можа звaліцца ў ваду і ніхто яго не ўратуе, то сама «пераламалася» і паплыла ўбок. Круча абсыпалася горкай жоўценькага пясочку. Дзіцятка ў тым пясочку села і пачало забаўляцца. Бацькі падбеглі і аслупянелі ад здзіўлення. Пасля сталі дзякаваць і Богу, і рацэ за такое дзівоснае ўратаванне.

Хутка шмат людзей даведалася пра гэты цуд. Усе гаварылі, што гэта шчаслівае месца, асветленае міласэрнасцю. Пачалі там сяліцца. Выросла вёска. І далі ёй назву Пералом.

Вось якую цікавую легенду пачула я ад незнаёмай бабулі.

Вольга Смалякова,
6 «Л» клас, гімназія № 2, Гродна

Каму ў спякоту піць не хочацца…

Маленькі прыгожы матыль сядзеў на кветцы дзьмухаўца, а сонца ўзбіралася вышэй і вышэй па сінім бязвоблачным небе.

«Аднак, горача! — пэўна ж, вырашыў матыль. — Трэба неадкладна пашукаць цень…»

Матыль зляцеў з кветкі і распачаў пошукі. Менавіта ў гэты момант я яго і ўбачыла. Дакладней, я ўбачыла, як ён, зрабіўшы над бярозкай круг, апусціўся на адзін з яе зялёных лісточкаў.

І раптам штосьці круглае і вельмі прыгожае бліснула побач з матылём.

«Каштоўны камень?» — падумалася мне.

Я ледзь было не працягнула руку да гэтага каменя, але спынілася. Па-першае, я не хацела патрывожыць матыля, па-другое, ніякі гэта быў не каштоўны камень. Звычайная кропля ранішняй расы, але яна ў гэты момант зіхацела і пералівалася на сонцы ўсімі колерамі вясёлкі.

Матыль таксама заўважыў побач з сабой кроплю, ды і цяжка было яе не заўважыць. Перамясціўшыся бліжэй да кроплі, ён выпрастаў свой доўгі хабаток і прысмактаўся да яе. І выпіў мой «каштоўны камень».

Вось так: тое, што для аднаго падаецца найпрыгажэйшай у свеце каштоўнасцю, для другога з'яўляецца магчымасцю проста наталіць смагу!

Але я не пакрыўдзілася за гэта на маленькага матыля, бо каму ў спякоту піць не хочацца…

Эма Трацэўская,
7 клас, гімназія, Светлагорск

Роля кнігі ў жыцці чалавека

Падарожжа ў тысячу міль пачынаецца з аднаго кроку
Старажытная кітайская прыказка

«Кнігі ўпрыгожваюць сцены, яны ж упрыгожваюць душы», — так прызнаваўся ў любові да кніг Франчэска Петрарка, італьянскі паэт і навуковец XVI стагоддзя. Кнігі акружаюць чалавека з самага ранняга дзяцінства. Спачатку гэта кніжкі-карцінкі, потым — вясёлыя вершы альбо казачныя гісторыі, якія мама, тата ці бабуля перад сном чытаюць дзецям.

А часам гэта займальная вандроўка ў чароўны свет казкі з дапамогай радыё, камп'ютара, тэлебачання. Але заўсёды за ўсім гэтым — разумная, добрая, светлая кніга.

Гэта ўнікальная з'ява культуры: яна дапамагла захаваць веды на працягу тысячагоддзяў. Праўда, да таго, як кніга набыла сучасны выгляд, прайшло шмат

часу. Каб замацаваць вопыт пакаленняў, зрабіць чалавечую думку неўміручай, людзі яшчэ ў старажытнасці вынайшлі пісьменнасць, а разам з ёй — кнігу. І не мела значэння тое, што першыя кнігі маглі выглядаць, як шаўковыя скруткі альбо гліняныя таблічкі. Не гэта галоўнае…

Галоўнае, што людзі таго часу імкнуліся да ведаў, чытання. Чаму ж многія з нас зараз забываюць пра гэта, перастаюць чытаць, спазнаваць свет з дапамогай кнігі?

Па-першае, як вы наогул уяўляеце жыццё без кніг? Гэта ж сумна і нецікава! Як іншы раз непрыемна глядзець на гультаёў, якія цэлымі днямі сядзяць за камп'ютарнымі гульнямі альбо бавяць час за праглядам тэлевізійных забаўляльных праграм! Якая ад гэтага карысць? А кніга — ключ да ведаў. Чытаючы яе, спасцігаеш нешта новае і карыснае. У антычныя часы існавала прыказка: «Людзі перастаюць думаць, калі перастаюць чытаць».

Па-другое, кніга развівае кругагляд. Гэта ж так цікава — зазірнуць у яе і ўбачыць мінулае: бітвы, цароў, рыцарскія турніры, геаграфічныя і навуковыя даследаванні. Менавіта з кніг можна даведацца пра гісторыю сваёй Радзімы, культуры і рэлігіі іншых народаў свету.

Па-трэцяе, кніга развівае мысленне і фантазію. Як здорава ўявіць сябе філосафам або матэматыкам, які вось-вось адкрые новы закон або сфармулюе тэарэму! Альбо хоць на хвіліну адчуць сябе фараонам Егіпта ці царыцай Клеапатрай! У думках пабываць у іншых краінах і гарадах розных гістарычных эпох, паслухаць імшу ў сярэдневечным храме, апынуцца ў царкве часу Лютэра ці ў саборы XIX стагоддзя…

Па-чацвёртае, кнігі дапамагаюць прымаць правільныя рашэнні. Іншы раз, гледзячы на герояў, мы пазнаём у іх сябе ці сяброў, вучымся на чужых памылках і стараемся іх не рабіць.

Па-пятае, чытаючы, мы становімся больш адукаванымі як у вуснай, так і ў пісьмовай мове. Мы папаўняем слоўнікавы запас, тым самым робім сябе больш цікавымі.

Але нельга забываць, што трэба чытаць тыя кнігі, якія падыходзяць да твайго ўзросту. Пагадзіцеся, глупства, калі, не даросшы да разумення дарослых твораў, малыя бяруцца за іх чытанне і потым хваляцца: «Я чытаў Івана Мележа ў трэцім класе».

Літаратура дапамагае развівацца, прымушае думаць, па-іншаму глядзець на свет. Я шчыра спадзяюся, што і да майго пакалення прыйдзе, нарэшце, разуменне таго, што размаўляць, тым больш сябраваць нашмат цікавей з чалавекам, які шмат чытае, а значыць, і шмат ведае.

Чытайце кнігі, дзеці і дарослыя!

Ганна Ласіца,
7 клас, Пратасевіцкая СШ, Асіповіцкі раён

Казкі школьнага ранца

Баран і Воўк

Сустрэліся неяк на ўзлеску Баран і Воўк.

— Куды ідзеш, Баран? — пытаецца Воўк. — І чаму адзін, без гаспадара?

— Уцёк я ад свайго гаспадара! — бляе Баран. — Іду па свеце праўду шукаць. Бо няма побач з людзьмі аніякай праўды! Поўсць на мне расце, а людзі яе састрыгаюць сабе на валёнкі. Ды што поўсць… скура ў мяне адна, ды і тую гаспадар у любы момант можа сабе на кажушок адабраць! Якая ж гэта праўда — крыўда адна!

Баран жаліцца, а Воўк толькі спачувальна галавой ківае, слёзы кіпцюрастай лапай выцірае. Па ўсяму бачна, шкадуе шэры свайго субяседніка.

— Ах ты, небарака! — заскуголіў Воўк, калі Баран, нарэшце, змарыўся пра крыўды свае апавядаць. — Бедны ты, гаротны, як жа мне цябе шкада! Так шкада, што і слоў няма аніякіх! Слухай, а пойдзем да мяне жыць, у логава маё. Праўда, там Ваўчыха з ваўчанятамі, але і табе як-небудзь месцейка знойдзем.

— А я тваім ваўчанятам спадабаюся? — пытаецца Баран.

— Ну, вядома ж, спадабаешся! — кажа Воўк. — І вельмі спадабаешся! Ніколі такога не было, каб бараны ды ваўкам не падабаліся!

Згадзіўся Баран, і павёў яго Воўк да свайго логава. А там…

А што там адбылося з Баранам, аб гэтым я вам расказваць не буду. Як і аб тым, ці спадабаўся ён ваўчанятам…

Самі здагадайцеся.

Эма Трацэўская,
7 клас, гімназія, Светлагорск

Заяўка на Парнас

Пра Компіка, Педаліка і хлопчыка Міколку

У самым звычайным горадзе, на самай звычайнай вуліцы, у зусім звычайным доме, у кватэры нумар трыццаць пяць жыў ды быў хлопчык, якога звалі Міколка. І вельмі любіў ён свой камп'ютар, нават мянушку яму даў — Компік. А яшчэ ў Міколкі быў ровар, якому ён таксама даў мянушку, — Педалік. Ды вось толькі пасля з'яўлення Компіка перастаў хлопчык на Педаліка ўвагу звяртаць.

Не паспее Міколка са школы прыйсці, як адразу ж уключае Компіка і пачынае гульню альбо перапіску з сябрамі.

— Піў-піў-піў! Поў-поў-поў!— толькі і чулася з ягонага пакоя. — Ты-дым! Ты-дым!

А ў нядзелю альбо на канікулах і наогул з самай раніцы ён за Компікам сядзеў.

Без адпачынку Компіку было вельмі цяжка. Але не толькі яму…

У гаражы, непадалёку ад дома, дзе жыў Міколка, побач з татавай машынай, сумавалі два ровары: Педалік і ровар таты Міколкі. Ім таксама было цяжка, але не таму, што працавалі без адпачынку, а таму, што пра іх забыліся гаспадары.

Вось так яны і жылі, але з цягам часу бацькоў Міколкі пачаў непакоіць празмерны інтарэс сына да камп'ютара.

— З гэтым трэба штосьці рабіць! — рашуча сказала мама тату. — Можа, проста забараніць часова камп'ютарныя гульні?

— Забарона — не лепшае выйсце! — уздыхнуў тата. — Але ты не хвалюйся, я што-небудзь прыдумаю!

І прыдумаў. Якраз на вясновых канікулах сына.

Стаяў сонечны дзень. Ужо на дрэвах з'явіліся ліпкія пупышкі, а ў садах рыхтавалі вялікі канцэрт птушкі. Міколка прачнуўся, пацягнуўся і паглядзеў у акно…

Вы мо падумалі, што ён, калі ўбачыў, якое на вуліцы добрае надвор'е, неадкладна пабег туды? Не, гэта не пра Міколку! Хлопчык адразу ж памкнуўся да свайго камп'ютара. Як толькі ўключыў, хацеў загрузіць гульню. Але яна чамусьці не грузілася. І тут…

— Прывітанне! — раптам высвецілася на экране. — Як спалася?

— Э-э-э… Добра, — разгублена адказаў Міколка. — А ты хто?

— Як гэта хто? — з'явіўся на экране новы надпіс. — Компік я, твой камп'ютар! Ты, бачу, зноў хочаш у нейкую гульню пагуляць?

— Хачу! — прызнаўся хлопчык.

— А вось я не хачу! — адказаў надпісам Компік. — Стаміўся я з табой, разумеш?! Працуеш, працуеш з ранку да ночы без адпачынку — дзень за днём, гадзіна за гадзінай.

І экран манітора згас.

У гэты час ў пакой увайшла мама.

— З кім ты зараз размаўляў? — запытала яна ў сына.

— Як гэта з кім? З Компікам!— адказаў Міколка.

Занепакоеная мама паклала далонь яму на лоб.

— Ідзі лепш снедаць, а то са сваім Компікам зусім стаміўся!

Міколка неахвотна, але ўстаў і пайшоў за маці на кухню. А ў гэты час хтосьці прыглушана ляснуў дзвярыма.

— Хто прыйшоў? — запытаўся сын у маці. — Ці выйшаў?

— Ды не, гэта вецер… — ўсміхнулася маці. — Гуляе…

— А дзе тата? Я хацеў, каб ён дапамог мне, — нешта камп'ютар не працуе.

— Тата на працы. А ты паснедай і схадзі на вуліцу. Глянь, якое надвор'е цудоўнае!

Міколка ўздыхнуў і пасля сняданку нехаця пацягнуўся да дзвярэй. Настрою на шпацыр не было ніякага.

Выйшаў у двор і, апусціўшы галаву, прысеў на лаўку. І што яму рабіць на гэтай вуліцы? Каля Компіка цікавей…

І тут міма, уздымаючы віхуры пылу, нехта пранёсся на ровары.

— Йо-хо-оо! Сынок, а ты чаго такі сумны?

— Тата?! — здзівіўся Міколка. — Ты ж на працы!

— Якая праца? — засмяяўся тата. — Сёння ж субота! Ты са сваім Компікам ужо і дні не лічыш, — і тата, ліха развярнуўшыся, прытармазіў каля самай лаўкі. — А пра старога сябра зусім забыўся. Вунь твой ровар стаіць каля плота! Хапай яго і паехалі катацца, а то ссутуліўся за зіму! Ды і я таксама не ў лепшай форме! Пакатаемся, а потым разам наладзім твой Компік і ў гульню тваю разам будзем біцца.

— Адкуль ты ведаеш, што ў мяне з Компікам праблемы? — насцярожыўся хлопчык.

— Ды вось, ведаю… — неяк хітравата ўсміхнуўся тата. — А што?

— Ды так, нічога!

Міколка таксама ўсміхнуўся тату і няўпэўнена сеў на Педаліка.

— Ну што, паехалі?

— Паехалі! — сказаў тата.

І яны паехалі, а маці глядзела на іх праз акно і ўсміхалася.

Марыя Шкляр,
7 клас, Бігосаўская СШ, Верхнядзвінскі раён
Малюнкі аўтара

Сын зямлі беларускай

1
У Падуі доктара лекарскіх ведаў,
Ліцвіна з Усходу тады хто не ведаў?
Усюды яго сустракалі, як сына…
Друкар з Белай Русі — Францішак Скарына!

У Полацку, Вільні, у Кракаве з Прагай
І зараз цябе ўспамінаюць з павагай,
Пра справы твае там легенды складаюць
І кветкі ля помнікаў ускладаюць.

Усё, што нашчадкам друкар наш пакінуў,
Так хочацца верыць, ніколі не згіне!
Хай свецяць заўсёды на нашай старонцы
Нязгасныя промні Скарынава сонца!

2
Прайшлі вякі, змянілася жыццё,
Яно даўно ўжо іншым стала,
Ды толькі не адыдзе ў забыццё
Той, хто для нас зрабіў нямала.

Ён прыклад падаé з глыбінь вякоў,
Як трэба ганарыцца родным краем.
Мы ісціны Скарынавых прадмоў
На роднай мове ў Біблії чытаем!

Дзіяна Бычкевіч,
10 клас, Дзераўнянская СШ,
Стаўбцоўскі раён

Радзіме

1
Ці бачыў ты лес,
поле вольнае,
неба?
А водар ці чуў ты
жытнёвага хлеба?
Глядзі: у небе зоркі
гуляюць да рання,
А з поля валошкі
ім шлюць прывітанне.
Слых лашчыць напеў
ручая,
салаўя…
Усё гэта — дом твой,
Радзіма твая!

2
Скажу я ад сэрца,
скажу — не зманю:
Радзіму сваю я,
як маці, люблю!
Не здраджу,
не кіну яе,
не забуду!
Заўсёды дачкой ёй
адданай я буду!

Маргарыта Пабягайла,
8 клас, СШ № 2, Заслаўе

Вясновы трыялет

Жвавая, бруістая вада
З сакавіцкім сонейкам у згодзе.
Веснавой парой заўсёды ў модзе
Жвавая, бруістая вада.
Так ужо заведзена ў прыродзе,
Што сярод сумётаў і ільда
Жвавая, бруістая вада
З сакавіцкім сонейкам у згодзе.

Вікторыя Валяватая,
8 клас, Заслаўская гімназія, клуб «Ізяслаўцы»

Роднае слова

Слова пявучае, роднае…
Што можа лепей гучаць?
Тут нават літара кожная
Можа ў нябёсы ўздымаць!

Словы складаюцца ў мову —
Сэрца народа ўсяго,
Казак, паданняў аснову,
Сэнс існавання майго.

Мову — свой скарб шматвяковы —
Павінны мы ўсе шанаваць:
Пакуль існуе наша мова,
Народ будзе з ёй існаваць!

Ціха ноччу на двары…

Ціха ноччу на двары,
Снег ляжыць, іскрыцца.
Харство начной пары
Вабіць…
Мне не спіцца!

Змоўкла ўсё…
Адна ў цішы
Птушкай ноч спявае.
Кволасць сонную ў душы
Песняй навявае.

Толькі я пакуль не сплю —
Спячы мар не мае!
Ноч для тых, хто не заснуў,
Цуды ажыўляе.

Катрын Ніцыеўская,
10 клас, Буда-Люшаўская СШ,
Буда-Кашалёўскі раён

Складаем казку разам

Незвычайныя прыгоды «валянцінкі»

20 гадзін 10 хвілін, 13 лютага

Жэня загадала жаданне: няхай у дзень Святога Валянціна выпадзе ёй шчасце. На большае смеласці не хапіла, бо дзяўчынка баялася нават сабе самой прызнацца ў новых сваіх пачуццях.

Усё пачалося ў пачатку трэцяй чвэрці, калі ў іх класе з'явіўся новенькі. Сяргей Высоцкі, высокі светлавалосы хлопчык з прыемнай усмешкай і… флейтай. Вось так, з флейтай, і прыйшоў…

Калі класная знаёміла новенькага з вучнямі, ён не выглядаў разгубленым альбо збянтэжаным. Больш таго: узяў ды і выйшаў да дошкі. Разам з флейтай.

— А можна, я выканаю для ўсіх вас адну мелодыю?

І, не чакаючы дазволу, паднёс інструмент да вуснаў. А Жэня ўпершыню ў жыцці пачула жывы голас флейты. Як і астатнія вучні. Хлопчыкі, вядома ж, пачалі ўсміхацца, а некаторыя нават грымаснічаць, што ж датычыцца дзяўчынак… Здаецца, усе яны адразу ж закахаліся. І Жэня не стала выключэннем.

Праўда, з-за сваёй празмернай сціпласці яна ніяк не асмельвалася адкрыта выражаць свае пачуцці, у адрозненне ад сябровак. Тыя ж наперабой частавалі Сяргея цукеркамі і жуйкамі, запрашалі ў кіно і нават на дні нараджэння, і гэтая іх празмерная ўвага да новенькага нязменна засмучала Жэню.

Супакойвала дзяўчынку толькі тое, што Сяргей, ветліва прымаючы ўсе гэтыя знакі ўвагі, нікога не вылучаў асабліва, да ўсіх ставіўся аднолькава роўна і прыязна. Усё на свеце аддала б Жэня, каб прыязнасць Сяргея мела дачыненне да яе адной, але як такога дабіцца? І параіцца няма з кім!

На дапамогу прыйшоў школьны каляндар.

— Увага! — сказала напярэдадні важатая. — Аб'яўляецца конкурс на лепшую «валянцінку»!

У конкурсе Жэня ўдзельнічаць не збіралася. Але за ідэю ўчапілася. Да вечара «валянцінка» была закончана: яркае бліскучае сэрца з цёплым сакрэтам — ключ да яе шчасця. Да выканання жадання заставалася роўна дваццаць чатыры гадзіны.

А, можа, сёння і пачаць? І што з таго, што рана?! Затое больш верагоднасці дабіцца свайго!

Жэня апранулася, ўзяла ў руку «валянцінку» і выйшла на вуліцу. Пунсовы глянец папяровага сэрца блішчэў і пераліваўся ў святле ліхтароў казачнымі зорачкамі.

— Эх, калі б я толькі была прынцэсай! — уздыхнула дзяўчынка.

Раптоўны парыў ветра наляцеў на Жэню, расхінуў яе куртку, узлахмаціў валасы і… вырваў з рукі «валянцінку».

— Вой! — толькі і паспела выдыхнуць Жэня.

Завея закружыла яе «шчасце» і панесла кудысьці ўздоўж вечаровай вуліцы.

20 гадзін 15 хвілін, 13 лютага

«Здаецца, я адпраўляюся ў сапраўднае паветранае падарожжа! — узрадавалася «валянцінка», танцуючы ў карагодзе сняжынак. — Магчыма, далячу да самых зорак! І нават змагу ім канкурэнцыю скласці! А што? Чым я горшая за зоркі? Я нават больш яркая і прыгожая — сапраўдная каралева зорак! Да таго ж, у мяне ўнутры таямніца!»

Але зоркі, як аказалася, былі занадта высока, а вецер — самы сапраўдны паветраны хуліган! Тры хвіліны карагода са сняжынкамі — і «валянцінка» плаўна апусцілася ў незамерзлы ручай.

«Падумаеш! — спакойна адрэагавала на змену сітуацыі «валянцінка», якая так і не стала каралевай зорак. — Вада ніяк не горшая за паветра! Так і быць, адпраўлюся ў кругасветны круіз! Тым больш, што на фоне гэтых чорных хваль я выглядаю яшчэ больш эфектна. Толькі б не прамокнуць…»

— Вой, якая міленькая і бліскучая! — пачулася зверху, а потым нейкая незразумелая сіла выхапіла падарожніцу з вады.

«Сіла» аказалася стракатай рукавічкай, дакладней, гаспадынькай гэтай рукавічкі дзяўчынкай Маруськай. Ёй споўнілася нядаўна шэсць гадоў, і рабіць «валянцінкі» яна яшчэ не ўмела. Затое вельмі хацела зрабіць прыемнае маме. І гэта ёй амаль удалося.

— Мамачка! — закрычала Маруська, размахваючы «валянцінкай». — Я цябе так люблю! І хачу падараваць табе гэта прыгожае сэрцайка!

— Сапраўды, прыгожае! — згадзілася маці дзяўчынкі. — Толькі мокрае чамусьці.

Яна хацела ўзяць з рукі дачушкі «валянцінку», але не паспела. Апярэдзіў Бублік, маленькі той-тэр'ер, якога маці з дачкой якраз і вывелі на вечаровую прагулку.

Бублік, здаецца, таксама меў уяўленне аб заўтрашнім свяце, таму што з усіх ног паімчаў насустрач сваёй сімпатыі, мопсісе Эльзе. Спыніўся каля яе, паклаў «валянцінку» каля тоўсценькіх кароценькіх лапак. Маўляў, вось табе ад мяне!

Эльза паблажліва чыхнула і нават пакруціла кароткім хвастком. На «валянцінку» яна не звярнула ніякай увагі, затое з Бублікам абышлася ласкава: куснула яго за вуха, дазволіла сябе абнюхаць і нават суправаджаць да заснежанай пясочніцы.

— Эй, куды гэта вы?! — абурылася «валянцінка». — А як жа я?!

Ёй так хацелася ўрачыстых сустрэч, радасных усмешак, а тут кусты ў снегавым палоне і сабакі, якія нават не разумеюць сапраўднай прыгажосці! Дык што ж ёй так і заставацца ў снежнай гурбіне?!

«Ну, не! — «валянцінка» напружылася і здолела выбрацца з гурбіны на паверхню. Развярнулася ў бок ліхтара, бліснула лакіраваным бокам, зіхатнула паеткамі. — Буду так ляжаць, няхай любуюцца ўсе! Хай здзіўляюцца, хвалююцца, ацэньваюць дызайн. Нават з сабой няхай забяруць, мне не шкада!»

Але, разважаючы так, «валянцінка» хітрыла. Шкада ёй было дзяўчынку Жэню, вельмі шкада. Ды сама вінаватая! Хіба ж можна такую прыгажосць не ўтрымаць, на вецер пусціць!

«Але ад палёту я б цяпер не адмовілася! — уздыхнула папяровая прыгажуня — Да зорак не даляцела, у кругасветны круіз таксама не адправілася. І шчасця сапраўднага нікому не прынесла! Хоць… Да свята яшчэ шмат часу. Можа, паспею? Вось толькі ўбранне сваё бліскучае у снезе не згубіць бы!»

20 гадзін 50 хвілін, 13 лютага

Прыклаўшы яшчэ крышачку намаганняў, «валянцінка» змагла саслізнуць з гурбы і ўладкавацца на сцежцы. Так больш надзейна. І святла тут шмат, і людзі ходзяць. Ёсць надзея, што хтосьці заўважыць…

Але час ішоў, людзі праходзілі, а «валянцінку» ніхто не браў.

— Сляпыя яны, ці што?! — бурчала «валянцінка», калі чарговы чалавек праходзіў міма. — Вой, што гэта?!

Яна зноў апынулася ў паветры і кудысьці імкліва панеслася. Дакладней, яе кудысьці панеслі. Хуткасць палёту была такая, што нават дыханне перахапіла. У вачах-пацерачках па чарзе мільгацелі то яркія вокны дамоў, то святло фар. А потым усё скончылася, і «валянцінка» трапіла ў вельмі непрыемнае месца. Сухія галінкі, скамечаныя паперкі, шматкі фольгі, камячкі поўсці — усё гэта ніяк не адпавядала яе ўяўленню аб прыгажосці.

— Ну, вось! — задаволена засакатала Сарока, якая прынесла «валянцінку» ў сваё зімовае жытло. — Недарэмна ж я ў цемры лётала, шукала! Зараз усе мае сяброўкі зайздросціць мне будуць! А ты, прыгажунька, — звярнулася Сарока да «валянцінкі», — ляжы і радуйся, што да мяне прыляцела! Бо я вельмі люблю бліскучае, табе тут добра будзе!

— Але ж у мяне іншае прызванне! — спалохана запярэчыла «валянцінка». — Мяне адна прынцэса ўласнымі рукамі зрабіла. Для прынца сваёй мары!

— І што з таго! — махнула крылом Сарока. — Мы, сарокі, хоць і не можам штосьці рукамі зрабіць, па прычыне іх адсутнасці, але прынцаў таксама маем! Вось заўтра з раніцы зможаш паназіраць, як рассядуцца гэтыя прынцы на бліжэйшых галінках. Я зараз багатая, сама з іх свайго прынца выбіраць буду! А можа, нават і караля, калі ў яго рэзідэнцыя вялікая! Мне з маім пасагам толькі ў лепшых месцах і сяліцца! Але хопіць балбатаць. Ты адпачывай, а мне трэба ў парадак сябе прывесці!

І Сарока, адсунуўшы ўбок «валянцінку», стала дзюбай прыгладжваць пер'е на ўласным хвасце, прычым яна час ад часу пазірала на сваю каштоўную знаходку, любуючыся яркімі яе блёсткамі і атласным бантам на макаўцы.

Сама ж «валянцінка» нічога гэтага не бачыла. Праз прасветы паміж галінкамі сумна глядзела яна ўніз, але там было надта цёмна і беспрытульна. Можна было б, зразумела, неяк праціснуцца паміж гэтымі галінкамі і звалiцца ўніз, але было страшнавата рабіць такое ў поўнай цемры.

«Давядзецца чакаць раніцы, — сумна вырашыла «валянцінка». — А то зноўку ў гурбіну траплю і прападу там, без славы і карысці!»

Яна ўладкавалася больш зручна сярод усяго таго, што сабрала Сарока, і заснула. І сніліся «валянцінцы» чароўныя прынцы, якія ветліва працягвалі яе юным

прынцэсам, а пасля запрашалі іх на танец. А вакол пеніліся марскія хвалі, і з павагай пазіралі зверху на «валянцінку» зоркі…

9 гадзін 30 хвілін, 14 лютага

Прачнулася «валянцінка» ад гучнага сакатання. І адразу ж зніклі чароўныя сны разам з прынцамі і прынцэсамі, замест іх яна ўбачыла вакол сябе ажно некалькі сарок, і кожная з іх першай жадала дакрануцца дзюбай да бліскучага сэрцайка.

— Вой! — спалохана выгукнула «валянцінка», забіваючыся ў самы ніз гнязда.

— Куды?! — засакатала Сарока-гаспадарка. — Уцячы вырашыла?! Вось я табе зараз…

Сарока хацела ўхапіць «валянцінку» дзюбай, але тая змагла нейкім цудам праціснуцца паміж сухімі галінкамі і плаўна спланіраваць проста на заснежаную сцяжынку.

— Глядзіце, што я знайшоў! — пачуўся дзіцячы крык, і «валянцінка» апынулася ў руцэ маленькага чырвонашчокага карапуза.

— Пакажы! Пакажы! — закрычалі іншыя дзеці, абступіўшы хлопчыка з усіх бакоў.

— Дзеці, час вяртацца ў групу! — захвалявалася выхавацельніца. — Прагулка закончана. Становімся парамі. Лёвушкін з Пятровай першыя!

9 гадзін 40 хвілін, 14 лютага

— Ну, і навошта было мяняць адно непаразуменне на другое?! — усхліпвала «валянцінка», апынуўшыся ў цеснай кішэні дзіцячай куртачкі. — Там, у гняздзе, мной хоць цікавіліся, а тут што?! Час ідзе, а я ляжу ў цемры, скамечаная, запэцканая! Каму я цяпер буду патрэбная?

Тут яна ўспомніла свае нядаўнія сны і яшчэ больш засмуцілася. Заплакала нават, але своечасова ўспомніла, што папера ад вільгаці намакае, і плакаць перастала.

«Яшчэ не вечар! — падумала, спрабуючы настроіць сябе на пазітыў. — І ўсё можа яшчэ нечакана змяніцца!»

І «валянцінка» паспрабавала хоць неяк прывесці сябе ў парадак, а асабліва шыкоўны свой бант, якому прыйшлося шмат чаго перажыць за апошні час.

10 гадзін 5 хвілін, 14 лютага

Усё ў Жэні пайшло навыварат. «Валянцінку», на якую ўскладаліся такія надзеі, знёс вецер. А для новай не знайшлося матэрыялаў. Нават клей і той скончыўся!

Ад перажыванняў Жэня ўчора доўга не магла заснуць, а калі заснула, то беззнадзейна праспала і нават спазнілася ў школу. Дакладней, паспела да другога ўрока, і вядома ж, атрымала вымову ад класнага кіраўніка.

Гэта само па сабе было дрэнна, але горш было назіраць, як аднакласніцы раздаюць налева і направа банальныя «валянцінкі», купленыя ў краме. Усе такія аднолькавыя, і надпісы стандартныя, і нічога яны не значаць.

Вядома ж, «валянцінак» больш за ўсіх атрымаў Сяргей, і Жэня ў засмучэнні нават не засталася на дыскатэку, якую пасля заканчэння ўрокаў пачалі ладзіць у школе. Проста збегла дадому, бо лепш паплакаць у адзіноце, чым зайздросціць больш шчаслівым аднакласніцам.

17 гадзін 30 хвілін, 14 лютага

— Ну, вось! Зноў спазнілася! — пакрыўджана засапеў Лёвушкін, сустракаючы старэйшую сястру ў гардэробнай. — Дамаўляліся ж: у пяць!

— Як змагла, так і прыйшла! — абарвала брата Вольга, якая была аднакласніцай Жэні і зараз, здаецца, кудысьці вельмі спяшалася. — І давай, хутчэй апранайся! У мяне спраў шмат!

Лёвушкін уздыхнуў і, апранаючы куртачку, нечакана намацаў у кішэні «валянцінку», якую раніцай падабраў на прагулцы.

— Глядзі, што ў мяне ёсць! — паказаў ён знаходку сястры.

— Ой, «валянцінка»! — усклікнула Вольга. — І такая прыгожая! Дзе ты яе ўзяў?

— Знайшоў, — сказаў Лёвушкін і, памаўчаўшы, дадаў: — Хочаш, табе падару?

— Хачу! — узрадавалася Вольга, выхопліваючы з рук брата «валянцінку». — Ты нават не ўяўляеш, брацік, як ты мяне выручыў!

Лёвушкін толькі плячыма паціснуў, затое «валянцінка» адразу ж акрыяла і нават затрымцела ад шчасця. З такой прыгажуняй, як Вольга, яна гатова была ісці аж на край свету! І нават далей…

18 гадзін 50 хвілін, 14 лютага

«Здаецца, усё скончылася! — усхліпнула Жэня, сумна пазіраючы на гадзіннік. — Дакладней, дыскатэка скончылася, і Сяргей захоча правесці кагосьці з дзяўчынак дадому. Алену, Жанну… а, хутчэй за ўсё, Вольгу, бо яна такая прыгожая! Не тое, што я…!

Жэня ўздыхнула.

«Сама вінаватая! — у думках выкрыкнула яна сабе. — Навошта было з «валянцінкай» на вуліцу выходзіць?! Тады б і ў школу не праспала, і «валянцінку» Сяргею ўручыла б!»

19 гадзін 5 хвілін, 14 лютага

Вольга змагла запрасіць Сяргея толькі на пяты па ліку танец, бо ён то на сцэне прападаў, то кружыў у вальсе з кімсьці з іншых дзяўчат. І ўвесь гэты час яна ў нецярпенні хадзіла па зале, трымаючы ў руцэ «валянцінку», якую падараваў ёй малодшы брат.

Нарэшце Вользе пашчасціла.

— Запрашаю цябе на танец! — аб'явіла яна Сяргею і працягнула бліскучае сэрца з бантам. — Гэта табе ад мяне!

Сяргей хацеў разгарнуць «валянцінку», але Вольга яго перапыніла.

— Потым прачытаеш!

Пасля дыскатэкі Сяргей і на самай справе вырашыў праводзіць Вольгу дадому. Але чамусьці ўвесь час ішоў моўчкі, і бачна было, што хлопец кудысьці спяшаецца.

«Хвалюецца! — вырашыла Вольга. — Ну, гэта нават да лепшага!»

А потым, калі Сяргей, развітаўшыся, таропка кудысьці пакрочыў, пачала па чарзе тэлефанаваць усім сяброўкам, каб падзяліцца з імі сваім несумненным поспехам. Праўда, Жэні Вольга не патэлефанавала.

20 гадзін 10 хвілін, 14 лютага

Ну, вось і ўсё! Час, які быў адведзены Жэняй для шчасця, выйшаў, а яно не адбылося! Цяпер засталося залезці ў ложак і паспрабаваць заснуць…

Жэня так і зрабіла. Маме патлумачыла, што галава разбалелася, мабільны тэлефон адключыла. Ёй хацелася як мага хутчэй перажыць гэты жахлівы дзень. А раніцай пачаць усё спачатку. Але ўжо без ілюзій і спадзяванняў.

Захінуўшыся ў коўдру, Жэня стомлена заплюшчыла вочы. Усё, ніякіх мар, ніякіх трызненняў! Заўтра яна пачне новае жыццё! Англійскую падцягне, матэматыку… У гурток які-небудзь запішацца…

Вось толькі сон ніяк не ідзе, хай яго!

20 гадзін 45 хвілін, 14 лютага

— Жэнь, ты яшчэ не спіш? — У пакой зазірнула маці. — Тут да цябе прыйшлі!

Узняўшыся з ложка, дзяўчынка без усялякай ахвоты пачала апранацца. Цікава, хто б гэта мог быць? Хутчэй за ўсё, Натка з дваццаць пятай кватэры. Той заўсёды пад вечар чагосьці трэба. То задачка не рашаецца, то малюнак не атрымліваецца…

— Ну, што табе сёння спатрэбілася ад мяне? — незадаволена буркнула яна, выходзячы ў пярэднюю.

І застыла, бо каля ўвахода заўважыла Сяргея.

Свайго казачнага прынца!

— Прабач, — вінавата прамармытаў ён, пераступаючы з нагі на нагу. — Я, напэўна, несвоечасова…

— Ды не, што ты! — схамянулася Жэня. — Давай, праходзь!

— Не, я на хвіліначку…

Сяргей працягнуў руку, і Жэня са здзіўленнем убачыла на ягонай далоні «валянцінку». Тую самую, якую ўчора вырваў з яе рукі свавольнік-вецер.

— Ведаеш, Вольга дала мне яе сёння на дыскатэцы, але я адразу здагадаўся, што гэта ты напісала. А чаму ты не засталася? Я вельмі хацеў запрасіць цябе на танец…

— Мяне? — прашаптала ўзрушаная Жэня і пачырванела. — Менавіта мяне?

— Менавіта цябе! — кіўнуў галавой Сяргей і таксама пачырванеў. — А давай я заўтра раніцай за табой зайду? Каб разам у школу ісці. Ты не супраць?

22 гадзіны 10 хвілін, 14 лютага

«Ну, вось і ўсё! — падумала задаволеная «валянцінка», паглядваючы з пісьмовага стала, на якім ляжала, на шчаслівага Сяргея, што пазіраў на гэта пунцовае сэрца. — Я сваю справу зрабіла! А далей ужо самі! Без мяне!»

Удзельнікі факультатыву «Вучуся творча думаць»
вучаніцы 4-га класа Гродзенскай СШ № 12 Ганна Альшэўская, Ангеліна Кадач
і Вікторыя Ключнік пры дапамозе пісьменніцы Ліны Багданавай



Фелікс Баторын

На вашых шпагах, кавалеры, ні кроплі праведнай крыві

Зімовы шпацыр

Белы свет. Белы снег.
Рэха схопленае ў мех,
Як гудлівы рой пчаліны,
Што з калоды цеснай збег.

У цішы ні душы,
Толькі ззяюць ледзяшы.
Праз карункі зелянеюць
Сонна елкі-спарышы.

На зямлі пры камлі
Як мурашнік узвялі.
Ружавеюць, быццам шчокі,
У галлі хмызоў гілі.

Глянь сюды: цвердзь вады —
Рэчка ўціснута ў ільды.
Размяжоўвае з ракою
Берагі чарот руды.

Хтось з бяроз снег атрос:
Хвост пушысты, чорны нос...
Эх! Не ў час да нас забраўся
У валёначкі мароз.

Як на грэх змрок набег.
Развязаўся ў небе мех.
І, звіхураны вятрыскам,
Паваліў шматамі снег.

У цяпло, у жытло
Пацягнула-павяло.
Толькі мы дайшлі дадому,
А сляды ўжо замяло.

Жартоўнае

Калі б у хлопчыкаў расла,
Як пушча, барада,
То з барадой бы той была
Сапраўдная бяда.

У ёй раслі б замест грыбоў
Панцак і буракі,
І не знайсці б там берагоў
Кісельнае ракі.

Калі б жа спрэчка не на жарт
Паўстала між сяброў,
О-то б успыхнуў там пажар,
Ды наламалі б дроў!

Ехаў дзязька з Мядзела…

Ехаў дзядзька з Мядзела.
Мудрасць дзядзьку здрадзіла:
Не паехаў цераз мост,
А падаўся ўброд наўпрост.
Пасярэдзіне ракі
З дна тырчэлі карчакі.
Зачапіліся калёсы —
Пакупацца давялося!

* * *

Так ціха наўкол, што чуваць,
Як скача сонечны зайчык.
На купінах дыбка стаяць
Травіцы чубы казачыя.
А вуж, як лянівы віж,
За мной нерухома сочыць.
Падпёр мурашыны Нясвіж
Сасну, што жывіцу сочыць.
Чакае грыбок-махавік,
Што я забяру яго ў кошык.
Тармозіць жыццё махавік,
Каб не парушыць раскошы.
Але, камарыны рай
У мяккай аздобе моху,
Кажу я табе: «Бывай!» —
Бо добранькага патроху,
Бо клопату ўпарты свярдзёл
У думках гудзець пачынае,
Бо ў пекле будняў кацёл
Ужо без мяне астывае.

Фелікс Баторын — аўтар паэтычных зборнікаў «Раніца», «Зялёны тралейбус», «Я дрэва пасадзіў», «Поглядам акідваю шлях», «На вуліцы Максіма Багдановіча», а таксама дакументальнай аповесці «Чорны шлях», якая апавядае аб трагічным лёсе беларускіх яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. А яшчэ ён перакладае на беларускую мову вершы нямецкіх, яўрэйскіх, польскіх і рускіх паэтаў, у тым ліку Гётэ, Гейнэ, Мандэльштама, Акуджавы.

Беларускія кавалеры

Ад свечак пах васковы ў зале,
Жаночы смех, крыштальны звон,
Кружэнне пар, мазуркі хвалі —
Праход, падтрымка і паклон.
У весняй квецені шпалеры,
У свеце ж белым — Пакравы.
На вашых шпагах, кавалеры,
Ні кроплі праведнай крыві.

Айчына — то не проста слова,
Не бранзалеты — кайданы.
Над Вільняй, Мінскам, Магілёвам
Гудуць паўстанцкія званы.
На плечы пыл асядзе шэры,
Абдасць смурод парахавы.
На вашых шпагах, кавалеры,
Ні кроплі праведнай крыві.

Нявестам мілым, верным жонкам
Дарыце ў памяць добрых дзён
Хто амулеты, хто пярсцёнкі,
Хто паланэз, хто медальён.
Урэшце пойдзеце за дзверы,
Хутчэй за ўсё, на гора вы.
На вашых шпагах, кавалеры,
Ні кроплі праведнай крыві.

Каму загінуць на Радзіме,
Каму ў чужых краях тужыць.
Дарогу жыццямі сваімі
Не вам да шчасця пралажыць.
Ды бараніць святую веру
Вам Богам дадзены правы.
На вашых шпагах, кавалеры,
Ні кроплі праведнай крыві.

Не красаванне, не какецтва —
Імёны, гербы, продкаў род.
Вам ганарлівае шляхецтва
Даруе некалі народ.
Вышэй штандары і — наперад!
Не па душы вам шлях крывы.
На вашых шпагах, кавалеры,
Ні кроплі праведнай крыві.

Скорагаворкі

* * *

У брывастага — бровы,
У дрывастага — дровы.
На прыпечку — дровы,
На прыпеку — бровы.
І дровы выгараць,
І бровы выгараць.

* * *

Клычыць лыкі Лука,
Лічыць лыкі рука,
Ці бабінай бабці
Хопіць на лапці.

* * *

Зблажэламу блазну
Залезці б у лазню.
На палкý ў лазні
Пот, як боб, выблісне.
Калі венік плясне,
Хваробы выплясне.

Тэрэза Кавальчук

Добрыя справы ходзяць, як цень, за добрым чалавекам

Уладзік спяшаўся ў касцёл, але яго позірк раптам затрымаўся на старым чалавеку з кіёчкам, які ніяк не мог трапіць з асфальту на тратуар. Уладзіку нават падалося, што адна нага ў яго зусім не згінаецца… Час ішоў, а чалавек працягваў бездапаможна таптацца на месцы.

Уладзік шпарка ўзбег па прыступках, але потым азірнуўся на старога і павярнуў назад. Не мог ён больш глядзець, як пакутуе гэты дзядуля. Узяўшы старога за абедзве рукі, Уладзік дапамог яму ўзысці на тратуар, адчуўшы пры гэтым, як змучана дрыжыць і скаланаецца нямоглае цела.

— Вы сябе дрэнна адчуваеце, не трэба было ісці аднаму да касцёла, — пажурыў яго Уладзік.

— Я цяпер так заўсёды сябе адчуваю, жыву адзін, а сёння вырашыў на юбілей зрабіць сабе падарунак — схадзіць да споведзі, таму што доўга ўжо не быў у касцёле, — цяжка дыхаючы, адказаў той.

— У вас сёння юбілей, я вас сардэчна віншую і жадаю здароўя і доўгіх гадоў жыцця, — Уладзік умеў віншаваць пажылых людзей, так ён і сваю бабулю заўжды віншаваў.

— Дзякуй табе, добры хлопчык, а як цябе зваць? — запытаў дзядуля.

— Мяне — Уладзік, а вас?

— А мяне — Пётр Іванавіч, вось і пазнаёміліся, — адказаў стары, занепакоена пазіраючы на занадта высокія прыступкі.

Уладзік перахапіў гэты погляд.

— Не турбуйцеся, Пётр Іванавіч, я дапамагу! — І не ўтрымаўся, дадаў: — Цікава, а як вы плануеце святкаваць свой юбілей?

— Святкаваць?

Стары сумнавата ўсміхнуўся.

— Мілы мой хлопчык, няма мне з кім святкаваць… Ды і сэнс які, наогул, рабіць гэта? Усе мае сябры даўно памерлі, родныя таксама, а год таму памерла жонка, якую я вельмі кахаў! І цяпер я адзін на ўсім белым свеце, стары, нямоглы і нікому не патрэбны. Таму вырашыў паспавядацца і ўсё… І нічога мне больш не трэба, проста буду рыхтавацца да смерці.

Пётр Іванавіч змоўк. Уладзік таксама маўчаў, дапамагаючы яму пераадольваць кожную прыступку. Але вось прыступкі скончыліся, і хлопчык спыніўся. У першую чаргу для таго, каб даць перадыхнуць спадарожніку.

І зноў нейкі час абодва маўчалі.

— А колькі вам гадоў? — запытаўся Уладзік. Яму надакучыла няёмкае маўчанне.

— Восемдзесят мне стукнула сёння, час збірацца ў вечную дарогу…

— Ну што вы такое кажаце?! — ажно абурыўся хлопчык. — Проста вам трэба падлячыць ногі і сэрца, і вы яшчэ зможаце пражыць гадоў пятнаццаць-дваццаць… Вунь наш сусед ажно дзевяноста шэсць гадоў пражыў, — дадаў ён, каб хоць крыху заспакоіць старога.

— Ты мне занадта шмат адмераў, мне столькі не трэба! — сумна ўсміхнуўся Пётр Іванавіч. — Але ад некалькіх месяцаў, нават ад года жыцця я б не адмовіўся, — сказаў ён, крыху памаўчаўшы. — Ёсць у мяне адна справа…

— Справа? — насцярожыўся Уладзік. — І што ж гэта за справа?

— Унучку сваю хачу адшукаць, Юлечку! — і стомлены твар старога нечакана засвяціўся шчырай і адначасова разгубленай усмешкай.

— А яна што, прапала? — не зразумеў хлопчык. — Унучка ваша…

Пётр Іванавіч зноў уздыхнуў.

— Не тое, каб прапала, проста мой сын, а яе бацька калісьці загінуў у Афганістане. Ну, калі там нашы войскі…

— Я ведаю, — таропка прагаварыў Уладзік. — Спачуваю!

— Дзякую! Дык вось пасля гэтага ягоная жонка Тамара выйшла другі раз замуж. Першы час яна наведвала мяне і Юлечку прыводзіла, але вось ўжо пяць гадоў, як я іх не чуў і не бачыў. Тэлефаную, а там, дзе яны жылі, нейкая іншая сям'я жыве. Сям'я гэтая купіла ў маёй нявесткі кватэру і не ведае нават, куды былыя гаспадары з'ехалі… Вось як яно бывае. Сказалі толькі, што, магчыма, яны недзе за мяжой…

— Што ж, цяпер модна ехаць за мяжу, — пагадзіўся з Пятром Іванавічам хлопчык. — Вунь з нашага дома сям'я таксама ў Германію пераехала…

— Божа мой, што ж гэта атрымліваецца? — прагаварыў з горыччу стары. — Пакідаць сваю краіну, бацькоў, радню, ехаць на край свету — гэта модна?! А вось я думаю: гэта не модна, гэта грэшна!

— І я з вамі згодны! — горача, з юнацкім запалам усклікнуў Уладзік. — І ніколі не захацеў бы пакідаць сваю краіну, якія б там залатыя горы мне ні паабяцалі!

У гэты час яны ўжо ўваходзілі ў касцёл.

Не адразу, але даволі хутка Уладзік адчуў, што прысутныя спадцішка паглядваюць у іх бок, але ніяк не мог зразумець прычыны гэтай празмернай увагі. А потым зразумеў: уся справа — у Пятры Іванавічы, дакладней, у ягоным адзенні, зашмальцаваным і нават месцамі брудным.

Хлопчыку зрабілася сорамна. Ён апусціў вочы і вырашыў пакінуць старога пасярод касцёла і адысці. І што тут такога: ён, здаецца, сваю справу зрабіў, дапамог Пятру Іванавічу дабрысці сюды. Што яшчэ ад яго можна патрабаваць?

Але, прайшоўшы некалькі крокаў і ўбачыўшы два вольныя месцы на адной з лавак, ён азірнуўся і пашукаў вачыма свайго нядаўняга суразмоўцу.

Пётр Іванавіч стаяў на ранейшым месцы і неяк па-асабліваму бездапаможна азіраўся наўкол. І, здаецца, нікому з прысутных не было да старога ніякай справы.

Тады, забыўшыся пра сорам, Уладзік вярнуўся, узяў Пятра Іванавіча пад руку і падвёў да лаўкі.

«Няхай глядзяць, калі і няма тут нявесткі альбо ўнучкі, дык, можа, хто іншы пазнае яго, і няхай ім будзе сорамна, а не мне! — са злосцю падумаў ён. — Гэта яны кінулі свайго дзядулю, як непатрэбнага дамашняга ката!»

Потым, калі з'явіўся ў спавядальніцы ксёндз, Уладзік, заняўшы Пятру Іванавічу месца і паклаўшы ягоную шапку, павёў яго спавядацца. Пасля гэтага стары, прыкметна ажыўшы, павесялеўшы і нават пасвятлеўшы тварам, уважліва слухаў імшу. І тады Уладзік вырашыў і далей дапамагчы яму.

Ён пачакаў Пятра Іванавіча пасля службы і дапамог дабрацца дадому. Па дарозе яны размаўлялі на розныя тэмы і, што дзіўна, разумелі адзін аднаго з паўслова.

— Можа, зойдзеш да мяне? — прапанаваў Пётр Іванавіч, калі яны стаялі ўжо каля самых дзвярэй ягонай кватэры. — Калі нікуды не спяшаешся…

Былі ў хлопчыка нейкія справы, але яны маглі і пачакаць, а вось гэты стары чалавек чакаць, на жаль, не мог. Не так шмат часу ў яго для гэтага засталося…

— Зайду, чаму не зайсці! — сказаў Уладзік. — Дзякую за запрашэнне!

У сваёй кватэры Пётр Іванавіч прапанаваў папіць гарбаты, і хлопчык паставіў чайнік, зрабіў бутэрброды і дапамог накрыць на стол. Выявілася, што дзядуля раней, да траўмы нагі, працаваў у школе настаўнікам, магчыма, таму Уладзіку так лёгка было падтрымліваць з ім гутарку.

У кватэры было шмат кніг, і Уладзік, які адрозніваўся ад сваіх сяброў тым, што вельмі любіў чытаць, адразу ж звярнуў увагу на кніжныя шафы. Заўважыўшы гэта, Пётр Іванавіч усміхнуўся:

— Можаш выбіраць любыя кнігі. Тут, дарэчы, шмат для цябе цікавага…

Так завязалася сяброўства паміж школьнікам і былым настаўнікам. Хлопчык пачаў часта наведвацца да старога, хадзіў для яго ў краму, прыбіраў у кватэры, гатаваў ежу, чытаў газеты і кнігі, таму што ў Пятра Іванавіча былі праблемы са

зрокам — не дапамагалі нават акуляры. А потым яны распрацавалі план, як адшукаць Юлечку.

Уладзік у думках яе асуджаў. Як жа магла яна так: пакінуць хворага і састарэлага дзядулю ў адзіноце! Ну, з яе маці ўсё зразумела: Пётр Іванавіч для гэтай жанчыны — чужы чалавек. Але ж Юлечка… ды хаця б у памяць пра бацьку магла паклапаціцца аб родным дзядулі!

Паразважаўшы, хлопчык расказаў усё гэта школьным сябрам, і яны разам распачалі пошукі. А для гэтага з дапамогай класнага кіраўніка стварылі «цімураўскі атрад». І Уладзік стаў у ім галоўным «цімураўцам».

Далей адбылося тое, чаго ён уявіць сабе не мог.

У «цімураўцы» пачалі запісвацца вучні не толькі з іх класа, але і з іншых. І не толькі запісвацца. Яны прыносілі Уладзіку звесткі… Раптам высветлілася, што такіх адзінокіх старых не так і мала ў іх горадзе. У некаторых ёсць дзеці, але яны не могуць або не жадаюць дапамагаць сваім састарэлым бацькам, а іншыя з гэтых дзяцей жывуць вельмі далёка, некаторыя — за мяжой.

У выніку атрымаўся вялікі спіс з трыццаці шасці прозвішч і імён з адрасамі. Надышоў час дзейнічаць.

З дапамогай класнага кіраўніка Уладзік падзяліў «цімураўцаў» на каманды, а потым кожная з іх атрымала першае заданне. Трэба было абысці нямоглых старых і даведацца, што ім патрэбна, якія іх праблемы неабходна вырашыць у першую чаргу.

Прыйшлося вучням часова забыць пра камп'ютарныя гульні. Праз нейкі час «цімураўцы» правялі сход, на якім абмяркавалі вынікі самых першых сваіх дзеянняў. І вось што высветлілася.

Некаторыя вучні баяліся, што іх бацькі будуць супраць гэтай дадатковай нагрузкі, што гэта будзе перашкаджаць іх вучобе, але пераважнай большасці бацькоў «цімураўская» праца іх сыноў і дачок спадабалася, у першую чаргу тым, што дзеці адарваліся нарэшце ад камп'ютараў. Больш за тое: многія бацькі ганарыліся тым, што іх дзеці ўдзельнічаюць у такой высакароднай справе.

Вучні бегалі ў краму купляць прадукты, дапамагалі па гаспадарцы, пісалі лісты ад імя старых іх дзецям і ўнукам. Бывалі выпадкі, калі трэба было вырашыць і больш сур'ёзныя праблемы: у кагосьці звязаныя з атрыманнем у спадчыну маёмасці, у іншых — з агародам або набыццём дроў і брыкету. Тады на дапамогу «цімураўцам» ахвотна прыходзілі іх бацькі і настаўнікі.

А пасля таго, як вучні змаглі адшукаць унучку Пятра Іванавіча, ён напісаў пра іх у газету, і пра справы «цімураўцаў» даведаўся ўвесь горад.

Дарэчы, Юля, якую ў думках так часта папракаў Уладзік, проста не ведала, што яе дзядуля жывы. Маці падманула дзяўчыну, паведаміўшы, што ён даўно памёр. Проста не хацела, каб дачка бегала да старога. Потым жанчына і сама перажывала за сваё махлярства, але ёй ужо сорамна было прызнацца ў сваім гэтым ганебным учынку.

Цяпер Юля амаль кожны дзень наведвае свайго дзядулю, і яны вельмі шчаслівыя тым, што зноў разам. Здароўе Пятра Іванавіча палепшала, жыццё займела сэнс. Цяпер яму вельмі хочацца пражыць столькі, колькі пажадаў яму некалі Уладзік. Ды і сам хлопчык час ад часу бывае ў Пятра Іванавіча і кожны раз успамінае пры гэтым сваю бабулю. Дакладней, яе словы: «Добрыя справы ходзяць, як цень, за добрым чалавекам».

—бяроzка—

Штомесячны грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс (для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту)
Выдаецца са снежня 1924 года
Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»

Заснавальнік
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Выдавецкі дом «Звязда»

Галоўны рэдактар
Кацярына Вячаславаўна Захарэвіч

Рэдакцыйная калегія:
Іна Віннік, Алесь Бадак, Ірына Буторына, Валерый Гапееў, Кацярына Глухоўская, Мікалай Грынько, Алесь Дубровскі, Алесь Карлюкевіч, Уладзімір Ліпскі, Уладзімір Мазго, Алена Масла, Уладзімір Матусевіч, Міхаіл Мірончык, Кацярына Мядзведзева, Вікторыя Мянанава, Вольга Праскаловіч, Наталля Пшанічная, Людміла Рублеўская, Вольга Русілка, Алена Руцкая, Таццяна Сівец, Раіса Сідарэнка, Святлана Сітнік, Аляксей Чарота, Таццяна Швед, Віктар Якжык.

Адрас рэдакцыі

Юрыдычны адрас:
Рэспубліка Беларусь, 220013, г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
info@zvyazda.minsk.by
Тэл./факс: 8 (017) 287-19-19.

Паштовы адрас:
Рэспубліка Беларусь, 220005, г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 39.
bjarozka@zviazda.by
http://www.maladost.lim.by/berezka
Тэл.: 8 (017) 284-85-24;
8 (017) 284-41-88.

Падпісныя індэксы:
74822 — індывідуальны
74888 — індывідуальны льготны для членаў БРПА
748222 — ведамасны
74879 — ведамасны льготны для ўстаноў адукацыі і культуры

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 210 ад 23.04.2013, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Выдавец
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Выдавецкі дом «Звязда».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Павел Якаўлевіч Сухарукаў

Намеснік галоўнага рэдактара:
Г. П. Аўласенка
Рэдактар:
Ю. С. Ваўчок
Мастацкі рэдактар:
А. У. Галота
Тэхнічны рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
Г. К. Кірэенка
Камп'ютарны набор:
А. Г. Кахноўская
Стылістычны рэдактар:
Г. І. Верабей

Падпісана да друку ??.03.2017 г.
Фармат 60х84 1/8. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 6,67.
Тыраж 840 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь

© РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», 2017

02 Па-дарасламу. Учора ўсе мы былі шчаслівыя
03 Калі сур'ёзна. Іронія лёсу ў тым, што яго няма?
04 Апытанка. З якімі ілюзіямі ў жыцці вам давялося развітацца?
06 Адзін дзень. Мядзведзік назаўсёды
09 Сітуацыя плюс. Алеся — Аліса: гісторыя по той бок люстэрка
13 13-я. Фотаздымак на памяць
14 Настаўніцкая на праслушцы. Легенды і паданні, або Што вучні думаюць пра настаўнікаў
16 Табе навука. Кропка апоры
18 Праектар. На мяжы сапраўднасці
20 Level 80. Дзяўчынка з палароідам
21 Гісторыя поспеху. Рэзервацыя гульняў
24 Зярняткі. Лісты да хрэсніка
25 Зярняткі. Прадбачанне Божае
25 Зярняткі. Прытча
26 Зярняткі. Нікога Бог не адбірае
27 Практыкум. Літаратурная «трэнажорка»
29 Я — мастак. Я ведаю мастацтва. Партрэт Кшыштафа Весялоўскага
32 Я — мастак. Я ведаю мастацтва. Творчасць — праява не толькі жыцця
35 Візуальныя нататкі
37 Бел. літ. Дэтэктыў ці хорар? Ідэнтыфікацыя «…Стаха»
39 Школа журналістыкі. Рэпартаж са Слуцкага КВЗ
41 Я сардэчка Беларусь. Адкуль пайшла назва вёскі Росіца
41 Я сардэчка Беларусь. Гэта так цудоўна, калі тваё асабістае свята супадае са святам твайго горада!
43 Я сардэчка Беларусь. Легенда пра вёску Пералом
44 Верасок. Проза. Каму ў спякоту піць не хочацца…
44 Верасок. Проза. Роля кнігі ў жыцці чалавека
46 Верасок. Проза. Баран і Воўк
46 Верасок. Проза. Пра Компіка, Педаліка і хлопчыка Міколку
48 Верасок. Паэзія
50 Верасок. Проза. Незвычайныя прыгоды «валянцінкі»
56 Літаратурныя старонкі. Паэзія. Фелікс Баторын. На вашых шпагах, кавалеры, ні кроплі праведнай крыві
60 Літаратурныя старонкі. Проза. Тэрэза Кавальчук. Добрыя справы ходзяць, як цень, за добрым чалавекам

На першай старонцы вокладкі змешчаны малюнак Анастасіі Сакалоўскай.

Тэма наступнага нумара — «Манія».

«Нашы Руіны»
Аўтарскі праект Уладзіміра Цвіркі

Мінская вобласць, Валожынскі раён.

Сядзіба Тышкевічаў, канец XIX стагоддзя.

У кожным нумары часопісаў «Маладосць» і «Бярозка». Поўны камплект выяў будзе мець той, хто чытае абодва выданні.

Часопіс «Вожык» прадстаўляе

Аўтар Аляксандар Каршакевіч

ISSN 0320-7579
9 770320 757007 17003